Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СНЕЖАНЬ 15 1933 г. ПЯТНІЦА № 276 (4820) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СУСТРЭЦЬ 17 З'ЕЗД НАШАЙ ПАРТЫІ ПЕРАВЫКАНАННЕМ ФІНПЛАНА ПА ЎСІХ ПЛАЦЯЖАХ

Паведамленне ЦК ВКП(б) аб скліканні 17 партз'езда выклікала новую хвалю вытворчага ўздыма ініцыятывы і энтузіязма сярод шырокіх працоўных мас нашай краіны. Дзесяткі мільёнаў лепшых ударнікаў фабрык, заводаў, калгасных і саўгасных палёў выносяць усё новыя і новыя прапановы аб паляпшэнні вытворчых працэсаў, бяруць канкрэтныя абавязкі сустрэць з'езд партыі новымі вытворчымі поспехамі і яснымі паказальнікамі.

Ініцыятыва перадавых фабрык і заводаў знайшла жывы водгук і ў кредытна-фінансавай сістэме Беларусі.

Першым у паход уключыўся МЕНСК. Работнікі фінансавай сістэмы пролетарскай сталіцы Беларусі абавязаліся шляхам шырока разгорнутай масавай работы фінансавы план 4-га квартала і гадавы план г. г., выканаць па ўсіх плацяжах да 20 снежня. Да гэтага-ж тэрміна ўзмацнюць ліквідацыю недоімкі з прыватнага сектара і забяспечыць аплату калгаснікамі абліпгацый па падпісцы на пазыку 2-й пяцігодкі. Шляхам наладжання абслугоўвання працоўнага мальнікаў і ўкладчыкаў давіцца таго, КАБ ДА ПАЧАТКУ РАБОТЫ З'ЕЗДА НЕ БЫЛО НІВОДНАГА ПРАЦОЎНАГА БЕЗ АБЛІГАЦЫІ ПА ПЯЗЫКІ 2-Й ПЯЦІГОДКІ, а таксама, каб поўнасцю выканаць студзеньскі фінансавы план.

Пачыну Менска паследаваў Віцебск і рад іншых раёнаў. Уключыўшыся ў перадз'ездаўскі паход, некаторыя раёны па-сапраўднаму разгарнулі работу і дабіліся вялізарнейшых поспехаў у выкананні ўзятых на сябе абавязкаў. ТУРАЎСКІ раён за два месяцы квартальны план выканаў на 89 проц., ЛЕПЕЛЬСКІ—на 84,5 проц. СЛУЦКІ—на 79,8 проц., МЕНСКІ—на 58,6 проц. і г. д. У раёнах выкананне плана праходзіць па шляху найменшага супраціўлення. Галоўная увага аддаецца працяглай на лёгкаму ўчастку работы — абавязкам плацяжам і зусім ігнаруюцца дабраахвотныя. Пры выкананні ўкладкі квартальнага фінплана па БССР на 70,7 проц., дабраахвотныя плацяжы выкананы толькі на 39,8 проц.

Узяць для прыклада хоць-бы БАБРУЙСКІ раён. У гэтым раёне квартальны фінплан па пазыцы 2-й пяцігодкі выкананы усяго на 47,5 проц. Па ўкладах у ашчадкасы на 12,7 проц., а разам па дабраахвотных плацяжах на 39,1 проц. Па 54 калгасах да гэтага часу калгаснікамі не ўнесена ні аднаго рубля па падпісцы на пазыку 2-й пяцігодкі.

Што робяць райком, райвыканком? Мабілізуюць масы на ліквідацыю прарыва? Разгортваюць шырокую масавую работу сярод рабочых і калгаснікаў?

Нічога падобнага. Яны выкідваюць на вуліцу дзве гарадскія ашчадныя касы. Бачыце, памяшканні, займаемыя касамі, знаходзяцца ў цэнтры горада і падыходзяць для кааператыўных крам, а не для ашчадных кас (!?!?).

А ці толькі ў Бабруйску такія адносіны да ашчадных кас? Не лепшыя па сваёй агіднасці ёсць факты і ў МАГІЛЕЎСКІМ раёне. Тут не гледзячы на рад пастаноў ЦК КП(б)Б аб забеспячэнні работнікаў ашчадных кас нараўне з іншымі супрацоўнікамі фінансава-банкаўскай сістэмы, раённыя арганізацыі ніяк не могуць вырашыць гэтага пытання.

ТАЛАЧЫНСКІ раён за два месяцы здолеў выканаць квартальны план па дабраахвотных плацяжах толькі на 11 проц., НАРАЎЛЯНСКІ на 12 проц., ЧАШНІЦКІ на 13,7 проц., ГОРАЦКІ на 16 проц., КРУПСКІ на 17 проц. і г. д. Гэтыя лічбы—ганебнейшы прыгавор райкомам, райвыканкомам, партыйным ячэйкам і сельсоветам аб іх нічога не вартай рабоце на фінансавым фронце. Гэтыя лічбы гавораць аб недаацэнцы фінансавай работы наогул і простым ігнараванні кіраўніцтвам перапічаных раёнаў указанняў нашай партыі аб тым, што: БЕЗ СУРОВАГА ВЫКАНАННЯ ФІНАНСАВАГА ПЛАНА НЕ МАГЧЫМА АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЕ ВЫЗНАЧАНЫХ ГАСПАДАРЧЫХ ПЛАНАЎ ВА ЎСІХ ГАЛІНАХ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ.

На вялікі жаль, шмат работнікаў яшчэ і на сённяшні дзень не хочуць зразумець таго, што НАРОДНАЯ ГАСПАДАРКА НЕ ЖЫВЕ РЫЎКАМІ, ШТО ФІНАНСАВАННЕ ЯЕ ЦАЛКАМ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД СІСТЭМАТЫЧНАГА ВЫКАНАННЯ ДАХОДНАЙ ЧАСТКІ ФІНАНСАВАГА ПЛАНА ПА ЎСІХ БЕЗ ВЫКЛЮЧЭННЯ ПЛАЦЯЖАХ.

Гэта асабліва прыходзіцца яшчэ і яшчэ раз падкрэсліць зараз, у 4 квартале, у якім фінансавая сістэма павінна закончыць беспарабойнае фінансаванне вялізарнейшага соцыялістычнага будаўніцтва гэтага года і забяспечыць адпаведныя прашовыя рэзервы для фінансавання будаўніцтва ў пачатку другога года 2-й пяцігодкі — пяцігодкі пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Зніжэнне тэмпаў, недавыкананне даходнай часткі фінансавага плана па таму ці іншаму плацяжу гэта значыць недабудова новай фабрыкі ці завода, недабудова новага жыллёвага дома, недавыпуск трактараў і аўтамабіляў, г. зн., урэшце, недавыпуск прамысловых тавараў, якія зараз, у сувязі з паляпшэннем матэрыяльных умоў рабочых і асабліва ў сувязі з рэалізацыяй багатага ўраджаю калгаснікаў, як ніколі патрабуюцца на шырокіх калгасных рынках.

Рашаючымі плацяжамі ў 4-м квартале з'яўляюцца дабраахвотныя плацяжы—пазыка, уклады ў ашчадныя касы, паі ў спажывецкай кааперацыі. Фінансава-крэдытная сістэма пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі павінна забяспечыць выкананне гэтых плацяжоў.

Партыйныя арганізацыі павінны дабіцца таго, каб ашчадныя касы сталі сапраўднымі разліковымі цэнтрамі на вёсцы. Касы павінны шляхам шырока разгорнутай масавай работы і ўзорнага абслугоўвання пазыкатрымальнікаў і ўкладчыкаў даказаць калгаснікаў усю карысць, усю выгаду, якую яны яму даюць.

На барацьбу за культурную совецкую ашчадную касу трэба ўзняць найшырэйшыя працоўныя масы. Трэба ператварыць кожную ашчадную касу ў гібкі, працаздольны, узорны дзяржаўны апарат па абслугоўванню працоўных. Толькі такая перабудова работы ашчадных кас забяспечыць магчымасць апошнім не толькі выконваць, але і перавыконваць свае фінансавыя планы.

Дрэнна наладзічай дрэнна працуе па мабілізацыі сродкаў і сістэма спажывецкай кааперацыі. Квартальныя заданні па прыцягненню пайовых узносаў спажывецкай кааперацыі Беларусі выканала толькі на 25,4 проц. Асабліва дрэнна ідзе паянакапленне зноў-такі на вёсцы, дзе квартальнае заданне выканана ўсяго на 17,5 проц., у той час як у горадзе яно выканана на 161,3 проц. Між тым рад раённых кіруючых кааперацыйных арганізацый гэта з'явішча, як відаць, лічаць зусім нармальным і не прымаюць мер да ліквідацыі прарыва.

Вялікім злом у спажывецкай кааперацыі і па сённяшні дзень з'яўляюцца растраты, з якімі яшчэ не вядзецца належная барацьба. Больш таго, у асобных раёнах ёсць яўнае патураннe растратчыкам з боку прафкуратуры і нарсудоў. Ва ЎВАРАВІЦКІМ раёне загадчык крыўскай крамы КРАСНЯКОЎ растраціў 2225 руб., загадчык блюдніцкай крамы РАНЯШЭЎСКІ—2943 руб., загадчык іванскай крамы ЧЫЖОЎ—4915 руб. і г. д. Ня гэтых крамнікаў заведзены справы, але гэтыя справы ў пракуратуры і нарсудзе ляжаць капя года (растраты па ўваравіцкай краме) без усялякага руху, а крамнікі і па сённяшні дзень гандлююць у крамах.

Фінансавая сістэма БССР пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, у жорсткай барацьбе з класава-варожым элементамі і іх агентамі—розныя апартуністамі, не раз паказвала ўзоры большэвіцкай ударнай барацьбы за выкананне сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Такой узорнай работы чакае краіна ад фінансавай сістэмы і зараз, напярэдадні сканчэння гаспадарчага года, напярэдадні 15-га з'езда КП(б)Б і 17-га з'езда ВКП(б). Ніводнага раёна, ніводнага сельсавета, які-б не выканаў фінплана 4-га квартала да 20 снежня і студзеньскага плана да адкрыцця 17-га з'езда ВКП(б) па ўсіх плацяжах. Масавы соцыялістычны паход за сустрэчу з'езду лепшымі паказальнікамі, у які ўключаюцца ўсе прадпрыемствы, усе калгасы і саўгасы, павінен быць шырока разгорнут і на фінансавым фронце.

Аб ходзе выканання пастановы ЦК ВКП(б) і СНК Саюза пра дапамогу бескароўным калгаснікам па Клімавіцкаму, Мсціслаўскаму, Чырвонапольскаму, Мазырскаму, Клічаўскаму і Уваравіцкаму раёнах і Наркамснабу БССР

Пастанова ЦК КП(б)Б

Разгледзеўшы пытанне аб ходзе выканання пастановы ЦК ВКП(б) і СНК Саюза аб дапамозе бескароўным калгаснікам па абазавядзенню каровамі, ЦК КП(б)Б адзначае:

1. ПА КЛІМАВІЦКАМУ РАЁНУ. Выключна дрэнны ход выканання пастановы ЦК ВКП(б) і СНК Саюза аб дапамозе бескароўным калгаснікам, адсутнасць канкрэтнага кіраўніцтва гэтай работай з боку партыйных і совецкіх арганізацый раёна, неразуменне імі ўсёй важнасці гэтай пастановы ў справе калгаснага будаўніцтва і выканання лозунга тав. Сталіна—зрабіць калгаснікаў заможнымі, што выявілася ў тым, што: ні РК, ні райвыканкомам не была праведзена праверка выканання данай пастановы, не было праведзена ніякай агітацыйна-растлумачальнай работы вакол рэалізацыі данай пастановы, не было дана ніякага адпора кулацкім антысовецкім гутаркам і сабатажу ў правядзенні гэтага мерапрыемства, што асабліва ярка ўскрылася за апошні час, як рэзультат праяўленага самацёка ў гэтай важнейшай справе з боку партыйных і совецкіх арганізацый раёна. Загадчык аграддзела пры выкліку ў ЦК не мог даць колькі-небудзь здавальняючага растлумачэння прычын падобнага становішча спраў у раёне, не гледзячы на тое, што як у час самога снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б, так і пасля пленума былі даны адпаведныя ўказаньні і папярэджаньні.

За падобны стан справы выканання важнейшага дзяржаўнага задання—ЦК пастанаўляе: вызваліць ад работы сакратара райкома тав. АЛАЯ, маючы на ўвазе таксама і тое, што тав. Алай, атрымаўшы рад папярэджанняў ЦК па другіх гаспадарча-палітычных работах у раёне, да гэтага часу не прыняў неабходных мер, забяспечваючых пералом у рабоце па Клімавіцкаму раёну.

Па тых-жа матывах вызваліць ад работы старшыні РВК тав. БУЯКОВА.

Папярэдзіць бюро РК, прэзідыум РВК і начпалітаддзела Клімавіцкага раёна, што калі раённае кіраўніцтва пасля данага рашэння ЦК КП(б)Б не пав'яцца рашучага пералома ў справе выканання важнейшых заданняў партыі і ўрада —па ільну і дапамозе бескароўным калгаснікам,—ЦК вымушан будзе зрабіць дальнейшыя вывады ў адносінах партыйнага і совецкага кіраўніцтва раёна.

Даручыць аргінстру і аддзелу кадраў ЦК у аднадзенны тэрмін намеціць і правесці апытаннем сакратарыята кандыдатуры сакратара РК і старшыні Клімавіцкага РВК, з тым, каб апошнія не позней 16 снежня выехалі на месца.

2. ПА ПУХАВІЦКАМУ РАЁНУ. За аналагічны стан справы дапамогі бескароўным калгаснікам і за непрыняцце мер супроць сабатажа пастановы ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ў радзе сельсоветаў і праўленняў калгасаў—зняць з работы старшыні РВК тав. СТУПАКОВА. Загадчыку райза ЛОГОЎДЗІНУ і звясці вымову з папярэджаннем. Папярэдзіць сакратара Пухавіцкага РК КП(б)Б тав. СКАРАХОДА, што ў выпадку невыканання пастановы аб дапамозе бескароўным калгаснікам у раёне,—і ў адносінах яго, як сакратара РК, будуць прыняты сур'ёзныя меры партыйнага спагнання.

3. ПА МСЦІСЛАЎСКАМУ РАЁНУ. За поўную адсутнасць кіраўніцтва работай па надзяленню бескароўных калгаснікаў цялятамі і няведаньне, як абстаіць гэта справа па асобных сельсоветах раёна,—зняць з работы старшыні Мсціслаўскага РВК тав. МАРОН і загадчыка райза тав. СІРОТКО. Папярэдзіць сакратара РК тав. ТАРАСАВА аб неабходнасці ў бліжэйшыя-ж дні дабіцца пералома ў рабоце па дапамозе бескароўным калгаснікам, з тым, каб забяспечыць поўнае выкананне плана не пазней 1 студзеня 1934 г.

4. ПА ЧЫРВОНАПОЛЬСКАМУ РАЁНУ. За адсутнасць канкрэтнага кіраўніцтва па ажыццяўленню пастановы саюзнага ўрада аб бескароўных калгасніках, непаладжанасць уліку, непрыняцце мер барацьбы са скажэннямі з боку паасобных сельсоветаў у практыцы правядзення пастановы ЦК і СНК СССР,—вызваліць ад работы старшыні Чырвонапольскага РВК тав. КІРЭЕВА.

5. За слабое кіраўніцтва работай па надзяленню бескароўных калгаснікаў цялятамі—абвясціць вымову старшыням Мазырскага, Уваравіцкага і Клічаўскага РВК т. т. ЖОГАВУ, КАРАЛЕНКА і ГРЫБАЕДАВУ. Загадчыка райза Мазырскага раёна тав. РАДЗІОНОВІЧА зняць з работы.

6. ЦК адзначае, што нам. начпалітаддзела Заслаўскага раёна тав. ДРАГУН на праведзенай радыёпера кліцы па пытанню выканання пастановы саюзнага ўрада аб дапамозе бескароўным калгаснікам у сваіх справаздачах стараўся адчаліцца агульнымі мясцамі, тым самым змазваў значэнне данай пастановы. Папярэдзіць тав. Драгуна аб недапушчальнасці ў далейшым падобных бездаказных выступленняў.

7. ЦК і СНК указваюць усім РК, начпалітаддзелам МТС і РВК, што па ўсіх няўдачных даных не можа быць ніякіх аговорак аб поўнай магчымасці закончыць выкананне пастановы ЦК ВКП(б) і СНК Саюза аб дапамозе бескароўным калгаснікам к студзеню месяцу 1934 г., як па рэспубліцы ў цэлым, так і па раёнах. ЦК і СНК папярэджваюць РК і РВК, што ўсялякае невыкананне работы ў правядзенні пастановы ЦК і СНК СССР, адсутнасць канкрэтнага аперацыйнага кіраўніцтва, кантроля за выкананнем яе—будзе з усёй прамчасцю перасякацца аж да прыняцця самых суровых мер спагнання ў адносінах як раённага кіраўніцтва, так і праўленняў калгасаў і сельсоветаў, маючы на ўвазе, што правядзенне ў жыццё данай пастановы саюзнага ўрада з'яўляецца адной з важнейшых і суставных частак усёй нашай работы на вёсцы.

Даручыць усім кемандыраваным ЦК на раён таварышам па пытаннях работы на вёсцы — у сваёй рабоце на месцах праводзіць сістэматычны кантроль выканання пастановы ЦК і СНК аб дапамозе бескароўным калгаснікам, прымаць на месцах канкрэтныя мерапрыемствы, якія забяспечваюць поўнае яе выкананне к пачатку 1934 года.

Даручыць т. т. Дзеніскевічу і Бенеку ў двухдзенны тэрмін намеціць і правесці апытаннем сакратарыята кандыдатуры старшынь Пухавіцкага, Мсціслаўскага і Чырвонапольскага РВК і Мсціслаўскага і Мазырскага заг. райзэ.

ПА НАРКАМСНАБУ.

Нам. наркамснаба БССР тав. КАРНАЧОВУ паставіць на від за тое, што ён аднёсся фармальна-бюракратычна да важнейшага палітычнага мерапрыемства партыі і ўрада — аб прадастаўленні ільгот калгаснікам і аднаасобнікам, у якім кантрактуюцца або закупляюцца цёлкі, абмежаваўся паперовай дырэктывай і не прыняў ніякіх мер для таго, каб арганізаваць фактычнае правядзенне гэтай дырэктывы на мясцах і кантроль за яе правядзеннем.

Начальніку сектара загатовак Наркамснаба тав. КОЗЕЛЯ, непасрэдна адказнага ў сістэме Наркамснаба за правядзенне данай дырэктывы, які не толькі не арганізаваў канкрэтнага аперацыйнага кіраўніцтва гэтым мерапрыемствам, не паставіў уліку выканання і кантроля за работай мясцовых органаў, але праявіў выключныя фармальна-бюракратычныя адносіны да справы, чым спрыяў зрыву гэтага мерапрыемства па лініі наркамснабаўскіх арганізацый, —з работы зняць.

Прапанаваць Наркамснабу неадкладна адхіліць ад работы кіраўніка Загатмяса тав. КОЗІЧА.

Абвясціць суровую вымову кіраўніку Белкаатмяса тав. КЛІМОВІЧУ за яўсім недапушчальнае затрыманне ў дачы дырэктыў сваім мясцовым органам па гэтаму пытанню з-за адсутнасці аперацыйнага кіраўніцтва, кантроля і уліку.

Даручыць пракурору рэспублікі правесці тэрміновае расследаванне вінаватых у невыкананні дамага важнейшага мерапрыемства партыі і ўрада, з тым, каб прыцягнуць іх да судовай адказнасці.

Даручыць т. т. Картукову, Коніку і Дзеніскевічу расследаваць, якім чынам тав. Козель, зняты з работы ў Талачынскім раёне за грубыя палітычныя памылкі, няўменне арганізаваць рашучы адпор кулацкаму сабатажу, праяўленаму ў Талачынскім раёне ў загатоўках, аказаўся на адказнай рабоце ў аппараце Наркамснаба, — і свае вывады і прапановы па гэтаму пытанню тэрмінова ўнесці сакратарыяту ЦК.

Прапанаваць тав. Гурэвічу прыняць усе меры да неадкладнага давядзення ўсіх мерапрыемстваў па прадастаўленні ільгот да кожнага калгасніка, аднаасобніка, дабіўшыся ў бліжэйшыя дні рашучага пералома ва ўсёй сістэме загатоўчых арганізацый па пытанню аб абавязковым давядзенні ільгот да гаспадарак, працаючых і кантрактуючых цёлак для бескароўных калгаснікаў.

Даручыць т. т. Дзеніскевічу і Георгадзе ў 2-дзённы тэрмін намеціць кандыдатуры буйных работнікаў у якасці начальніка сектара загатовак НКСнаба і кіраўніка Белзагатмяса.

ПА КРЭДЫТАВАННЮ:

Даручыць т. т. Бенеку, Ляхаву і Бушуеву намеціць суму мерапрыемстваў, якія забяспечваюць кантроль давядзення крэдытаў да калгаснікаў і аднаасобнікаў, кантрактуючых і куплячых цёлак, і скарыстання гэтых сродкаў праўленнямі калгасаў.

Даручыць РК КП(б)Б, РВК і райаддзяленням Дзяржбанка арганізаваць на мясцах выбарачную праверку скарыстання крэдытаў, прадстаўляемых калгаснікам для куплі каровы — непасрэдна ў калгасах. Гэту работу правесці ў пяцідзённы тэрмін з пасылкай спецыяльных дакладных запісак па гэтаму пытанню ўпаўнаважанаму ЦК тав. Чэрвякову.

Мсціслаўскі РВК патурае кулацкаму сабатажу ільназагатовак

ПОЎНАЙ ЗДАЧАЙ ВЫСОКАЯКАСНАГА ІЛЬНУ ЗАБЯСПЕЧЫМ ПАДВАЕННЕ І ПАТРАЕННЕ ВЫПУСКА ТАВАРАЎ ШЫРСПАЖЫВА

Чаму Мсціслаўшчына на чорнай дошцы

МСЦІСЛАЎ. (Наш спец. кар.). Мсціслаўскі раён меў усе магчымасці быць перадавым у БССР. У раёне быў высокі ўраджай тэхнічных культур. Лён своячасова выперабілі і паслалі на спелішчах. Але на гэтым раённыя арганізацыі супакоіліся. Да апошняга часу аб апрацоўцы ільну і здачы яго дзяржаве як след не гаварылі ні ў РК, ні ў РВК. На сёння план па ільнавалакну ў раёне выканаў толькі на 17,1 проц., па ільнатрасце — на 10 проц. Лічбы вельмі ганебныя.

Каб дапамагчы сельсоветам і калгасам, паскорыць выкананне гэтай важнейшай задачы, нават не мабілізаваў раённы партыйны актыў. Праўда, спісы «ўпаўнаважаных» складзены райкомам даўно, але самі ўпаўнаважаныя і не думаюць выяжджаць у сельсоветы.

Апрацоўка ільнавалакна і здача яго дзяржаве прадастаўлена поўнаму самацёку. І вось вынікі: у Татарычынскім сельсавеце застаюся зімаваць на спелішчах каля 50 га ільнатрасты. Каля сотні тон трасты стаіць на спелішчах у кучах. У калгасе «Перамога комуна ра», Мазалаўскага сельсавета, уся траста яшчэ ляжыць на спелішчах.

У многіх калгасах трасты гніе і раскрадваецца. Людзі, адказныя за яе захаванне ў часе апрацоўкі, не вылучаны. У калгасах не вылучаны звенні з лепшых калгаснік-ударнік для пераапрацоўкі ільну.

Напрыклад, у калгасе «Чырвоны барацьбіт», Пацолтаўскага сельсавета, брыгады не створаны, і большасць калгаснік зусім не выходзяць на апрацоўку ільну. Апрацоўка валакна вельмі дрэнная. Ільнаўзалажно пакуцлачанае, напалову з кастрыцай. Частка ільнатрасты ў гэтым калгасе распятпутана па хатах. Праўленне калгаса, у прыватнасці старшыня Малінаўскі, сваёй бяздзейнасцю, пераагаванем на гэтыя злачынствы дапамагае кулацкім элементам у зрыве ільназагатовак. Вядае аб гэтым і сакратар сельпартячэйкі Кудалёў. У вынніку калгас недадаў дзяржаве па сёння 60 цэнт. ільнавалакна.

Такія факты разбазарвання ільнапрадукцыі можна бачыць у многіх калгасах. Райвыканком (старшыня тав. Марон) і райза ведаюць аб гэтых праявах злоснага кулацкага сабатажа, але мер не прымаюць і гэтым пакрываюць злачынцаў.

У многіх калгасах зусім няма ільнаапрацоўчых машын. Лён апрацоўваюць выключна рукамі. А на станцыі Ходасы ўжо каля месяца ляжыць 12 ільнатрапалак. Чыгунка рыхтуецца прадаваць іх з таргоў.

У раёне зусім не наладжан разлік са здатчыкамі ільну. Многія перадавыя калгасы, якія здалі дзяржаве ўжо 75-80 проц. ільнавалакна, яшчэ на сёння за сваю працаўцыю нічога не атрымалі.

Напрыклад, калгасы Мазалаўскага сельсавета здалі ўжо 80 проц. свайго задання. Загатлён зацяжвае разлік з імі. Пасля гэтага ў калгасах пала працоўная дысцыпліна. Апрацоўку ільну ў гэтых сельсоветах зусім спынілі.

Кулацкія элементы, карыстаючыся гэтым момантам, вядуць шалёную атітацыю супроць ільназагатовак, за разбазарванне ільнапрадукцыі.

Вось чаму ільнаводная Мсціслаўшчына, якая павінна была быць перадавікам па БССР, не выходзіць з глыбокага прарыва па ільназагатоўках.

А. Мароз.

ПАД ПРЫКРЫЦЦЁМ КУЛАЦКІХ АКТАЎ

Шохі Сіроцінскага ільназавода № 34 пустыя. Толькі ў адным куточку ляжыць каля 45 тон трасты. Гэта — на паўмесяца работы адной турбіны. Завод-жа двухтурбінны. Праўда, пакуль што працуе адна турбіна, але дырэктар завода т. Селіванаў заявляе, што праз месяц будзе пушчана і другая.

План загатовак трасты заводу дан у 1555 тон, улічваючы патрэбнасць у сыравіне адной турбіны. Пойдзе другая, значыць сыравіны патрэбна будзе амаль у два разы больш. Такія вытворчыя магчымасці завода.

Чаму-ж пустыя шохі? На 5-е снежня загатоўлена толькі 1241 цэнтнераў турбіннай трасты (11 проц. гадавога задання) і 333 цэнтнеры кудзельнай (2 проц. гадавога задання). Якасць загатоўленай прадукцыі досыць высокая: сярэдні нумар — 1,69.

Гэта, аднак, не перашкаджае дырэктару завода т. Селіванаву заяўляць:

— Плана загатовак па якасных показальніках не выканаем. Траста ў калгасах нізкаякасная...

Каб падмацаваць сваю заяву, Селіванаў паказвае справу з кіпай пустых актаў, а пры актах — авоўная ведамасць. Аўтар актаў — спецыяліст завода Печанкоў. Ён пастараўся, «напрацаваў» для таго, каб давесці, што «уся траста дрэнная».

Вось ведамасць па Спасскаму сельсавету. Пад доўгай калонкай лічбаў аб паяўнасці трасты ў калгасах стаіць сума: трасты № 1, 5... 4,1 тоны. Дзе-ж астатняя траста? Печанкоў расшыфроўвае:

— У калгасе «Чырвоная ніва» трасты № 0,5 — 5 цэнтнераў, астатняя (8 гектараў) на полі.

— У калгасе «Серп і молат» — 3 тоны, астатняя ў капусах на полі.

Печанкоў «працаваў» і ў Дабейскім сельсавеце. Ведамасць падаўлена таксама: трасты, годнай для завода, у калгасах сельсавета ёсць... 9,3 тоны.

— У калгасе «Комсомолец» — 3 цэнтнеры, астатняя на полі.

— У калгасе «Пісарава»—1 тона, астатняя на полі і г. д.

Глядзім яшчэ адну ведамасць па 21 калгасу ў розных сельсоветах. Вывад такі-ж: у наяўнасці 135,6 тон турбіннай трасты, астатняя або на полі, або зусім «нізкай» якасці.

Но трэба даводзіць, што гэта — злосная кулацкая брахня. Шмат добрай трасты ёсць у калгасах, якая своячасова паднята са спелішчаў. Але і тая, што была застаўшаяся на полі, — не прапалчая траста, яе можна і трэба ўбраць, падсушыць і здаць заводу ці апрацаваць рукамі.

Аб гэтым завод не хоча і думаць.

Бліскучы прыклад з калгаса «ЧЫРВОНЫ ПУЦІЛАВЕЦ» ушчэнт разбівае кулацкую страшню «работнікаў» з Сіроцінскага ільназавода № 34. Гэты калгас — адзін з буйнейшых у раёне. Паводле плана ён павінен быў здаць дзяржаве 229 цэнтн. трасты. Як і ў шмат іншых сіроцінскіх калгасах, тут засталося на полі 35 гектараў трасты. Не апусцілі рукі ў калгасе. Мабілізавалі ўсе сілы на ратаванне ільну. Працавалі дзень і ноч. Дзень і ноч сушылі мёрзлую, абвеяную снегам трату, спачатку ў лазнях, а потым у бўнах дасушвалі. Бесперашыпна тачылі ліса 19 лазняў і 5 бўнаў. У вынніку, з 16-га лістапада да 4 снежня планзлачы трасты дзяржаве поўнасцю выкананы і перавыкананы: здана 232 цэнтн. трасты і натуранлаты МТС — 32 цэнтн. І якасць высокая: нумары 1,5 — 1,75 і нават 2. Колькасныя і якасныя паказальнікі кантрактацыйнага дагавора перавыкананы, і ў калгасе засталося яшчэ каля 50 тон трасты.

Старшыня калгаса т. МІРОНЕНКА сам прыходзіць на завод і просіць дырэктара Селіванава:

— Прымаце астатнюю трату. Бусе каля 20 проц. кудзельнай і 80 проц. турбіннай. Па турбіннай трасце мы выканалі план. Зашы плана хочам здаць яшчэ каля 50 тон. У тым ліку каля 20 проц. кудзельнай. Няўжо не можам?

Не дапамаглі просьбы. Селіванаў артачыцца:

— Давай толькі турбінную...

Пасля ўсяго гэтага і разумела, чаму пустыя шохі: сама ільнатраста на завод не ідзе, а дырэктары ільназаводаў загатовак не толькі не арганізоўваюць, а, наадварот,—крыўдзяць, ідучы на паваду ў кулака.

Селіванаву і яго праўдаўлікам у калгасах — аўтарам шкодніцкіх актаў — месца не на ільназаводзе, а на лаве падсудных.

А.

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ МЕНСК АПАЛАМ

Замест 80% аўтамашын мабілізавана 30%, працуе 15%

ВІНАВАТЫХ—ДА ПАРТЫЙНАЙ І СУДОВАЙ АДКАЗНАСЦІ

Агідное становішча з мабілізацыяй аўтатранспарта прадаўжаецца. Паводле нарадаў гарсовета ўчора раніцай павінны былі выехаць для работы дроў з Чэрвеня 44 грузавікі, а фактычна, выехала толькі 28. З 44-х машын дзве аказаліся ў рамонце, а 4 былі мабілізаваны памылкова: маюць установах — Ільнатрактарацтры і Белпацтрэсце машын не хапала. Гэта, да рэчы, даволі красамоўна характарызуе якасць уліка аўтатранспарта, які вядзе гарсовет. 11 аўтамашын не выехалі на вазьбу дроў па віне кіраўнікоў устаноў, якім гэтыя машыны належаць. Зноў мы зноў сутыкаемся з яўным абатажам пастановы ЦК КП(б)Б аб мабілізацыі 80 проц. машын на вывазку дроў. На жаль, сярод гэтых устаноў знаходзяцца такія, якія, здавалася, павінны былі быць узорнымі для ўсіх іншых. Мы маем на ўвазе апарат ЦВК БССР у асобе загадчыка сакратарыята тав. Алэйнова, які папярэдзіў загадзя, каб да яго дарэмна не хадзілі і не турбавалі, бо ён машыну ўсёроўна не дасць. У Саўнаркоме замест машыны даў «даведку» аб тым, «што аўтамашыны ўрадавага гаража не былі накіраўлены ў Менскі гарадскі совет на падставе распараджэння нам. старшыні Совета Народных Камісараў БССР тав. Балціна». І подпіс — «Нам. кіраўніка справ СНК БССР А. Мацко». Апаратам ЦВК і СНК не пашкадавала-б узяць прыклад са школы шофераў, якая заўсёды мабілізаванай адной машыны ўсылала на вывазку дроў дзве.

Нейкую дзіўную пазіцыю заняў у гэтым пытанні тав. Гальштэйн з Галоўдартранса, які паставіў ЦК наперадзе алным з адказных за мабілізацыю транспарта. На просьбы гарсовета аб мабілізацыі машын галоўдартрансаўскіх прызвініў тав. Гальштэйн напісаў рэзалюцыю: «Тарасевічу. Выканаць», а ў словах даў распараджэнне таксама-ж Тарасевічу не знімаць машын з участкаў. Таму замест васьмі грузавікоў на вывазку дроў выехалі толькі дзве.

Кіраўнік Белкаатранса Рудзіцкі замест двух грузавікоў даў толькі адзін, трэст будматэрыялаў (кіраўнік тав. Бампі) замест пяці грузавікоў даў тры.

У выніку пастанова ЦК аб мабілізацыі 80 проц. грузавога аўтатранспарта Менска на вывазку дроў дагэтуль не выканана. Замест 80 проц. гарсовет мабілізаваў толькі 30 проц., а фактычна працуе на вывазцы дроў толькі 15 проц.

З гэтай практыкай грубейшага ігнаравання дырэктывы ЦК КП(б)Б трэба неадкладна пакончыць. Учора, выдзіканыя ў гар. КК-РСІ т. т. Глейхангэўз, Фейгін і Марголін атрымалі ад старшыні гарКК тав. Хадасевіча першае папярэджанне, што калі яны не пашлюць машыны за дрывамі для рабочых Менска, яны будуць прыцягнуты да сурсовай партыйнай адказнасці. Гэта папярэджанне павінны ўлічыць усе тыя, хто за вузка-ведамственымі інтарэсамі не бачаць усяго палітычнага значэння своячасовага і поўнага забеспячэння рабочых Менска апалам.

***

Найбольш вузкім месцам у падвозцы дроў усё яшчэ з'яўляецца чыгуначны транспарт, ад якога галоўным чынам залежыць выкананне задачы. На 13 снежня асіпавіцкі, пятрыкоўскі, мазырскі, бабруйскі і клічаўскі лесапрамгасы далі чыгуначнай адміністрацыі заяўку на 333 вагоны для пагрузкі дроў. Аднак, чыгуначная адміністрацыя падала для пагрузкі толькі 113 вагонаў. Пасля пагрузкі паданых 13 снежня вагонаў ля чыгуначнага палатна гэтых лесапрамгасаў засталося дроў яшчэ на 798 вагонаў. Як відаць, уся справа зараз у тым, каб не толькі выканаць, але і перавыканаць заяўкі лесапрамгасаў на падачу паражняка. З гэтай задачай чыгунка пакуль што не спраўляецца, ігнаруючы дырэктыву ЦК КП(б)Б аб пагрузцы штодзённа для Менска 150 вагонаў дроў. За гэтую справу нясуць поўную адказнасць начальнік раёна ў Жлобіне тав. Ерамееў К. Г. і старэйшы дыспетчар Панамароў К. Г., начальнік раёна ў Гомелі тав. Дымускоў М. М. і старэйшы дыспетчар Іонан, які, да рэчы, увесь час зрывае план адгрузкі дроў.

Мы лічым, што заява прадстаўніка ўпаўнаркамшляху тав. Фельцман аб тым, што яна на працягу 5-6 дзён забяспечыць штодзённую падачу 150 вагонаў для пагрузкі, не павінна застацца пустымі словамі. Мы чакаем ад упаўнаркамшляху канкрэтных мерапрыемстваў і неадкладнага пералома ў падачы паражняка.

Адначасова трэба спыніць факты, якія гэтымі днямі мелі месца на ст. Брожа (раён Бабруйскага лесапрамгаса). 10 снежня на ст. Брожа трэба было падаць планавы маршрут у 35 вагонаў. Рабочыя і адміністрацыйны персанал чакалі маршрута да 11 гадзін раніцы, калі начальнік станцыі заявіў ім, што вагонаў не будзе. Рабочыя разышліся па дамах, а кіраўнікі лесапрамгаса паехалі ў Бабруйск. Аднак, праз гадзіну прыбыў маршрут і прышлося патрацціць шмат часу і энергіі, каб не сарваць пагрузку вагонаў.

8-га снежня на той-жа станцыі чакалі маршрута ў колькасці 35 вагонаў, аднак, падалі толькі 10. Астатнія прышлі ў 5 гадз. 30 м. увечары і з прычыны позняга часу былі пагружаны толькі ў наступны дзень — 9 снежня.

Гэтыя факты, якія сведчаць аб вельмі невыразнай рабоце старэйшага дыспетчара ст. Жлобін тав. Панамарава, павінны быць улічаны ўпаўнаркамшляхам.

***

Дагэтуль не вырашана пытанне аб размеркаванні дроў паміж прамысловасцю і гартопам згодна пастановы ЦК. Так, з 109 вагонаў, прыбыўшых 13 снежня, гартоп атрымаў для рабочага насельніцтва і закрытых устаноў толькі 35 вагонаў замест 54-55. Дагэтуль леса/набзбыт і гартоп не вырашылі, як на практыцы ажыццявіць пастанову ЦК. Справа ў тым, што рэшта з 6-мі лесапрамгасаў няць былі замацаваны

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Сістэматычная і глыбокая праверка выканання ўказанняў камісій па чыстцы павінна забяспечыць высокі ўзровень кампаніі перавыбараў парторганаў

Рэзультат прытуплення класавай пільнасці

Нядаўна закончылася чыстка партыйнай арганізацыі Мсціслаўшчыны. Чыстка паказала вялікую засмечанасць партыйнай арганізацыі класава-чужымі і буржуазна-перараджанскімі элементамі. Выключана з партыі 78 чалавек.

У працэсе чысткі калгасных і саўгасных партыйных ячэек выявілася, што асобныя «комуністы» — кулакі і перараджэнцы, прыкрываючыся партбілетамі, разам з класавым ворагам праводзілі ў калгасах падрыўную работу, зрываючы выкананне загатовак збожжа, ільну, бульбы і іншых відаў с.-г. прадукцыі. У выніку гэтага Мсціслаўшчына аказалася ў ліку адстаючых раёнаў амаль па ўсіх відах загатовак, асабліва па ільну.

Нават загаз, калі раён за адставанне ў загатоўках ільну занесен на чорную дошку, раённае кіраўніцтва не забяспечвае належнага пералома ў барацьбе за лён.

Значным тормазам у выкананні плана ільназагатовак з'яўляюцца слабыя тэмпы і нізкая якасць апрацоўкі ільнатрасты. Як правіла, у большасці калгасаў апрацоўка трасты праводзіцца ручным спосабам. Ільнамялкі-ж і ільнапрапалкі яўна інгадуюцца. Прысланыя ў раён 16 ільнатрапалак прастаялі на станцыі Хсдасы больш доўгі толькі таму, што калгасы адмаўляліся іх браць.

У рэзультаце прытуплення класавай пільнасці з боку многіх партыйных ячэек значная колькасць калгасаў аказалася засмечанымі кулакамі.

У калгасе «Новая зорка», Шамаўскага сельсавета, напрыклад, у праўленні аказаліся тры кулакі — **Сташоў, Чэраповіч, Гранэў.** Брыгадзірам быў б. шэфдазаданнік **Хайнеўскі.** У калгасе **«XIII Кастрычнік»** старшыня калгаса комуніст **Налбраў** зрося з кулакамі і пад іх уплывам разгальваў калгас. З прычыны безгаспадарчасці ў калгасе зашэ 200 пуд. ільнасемя, сапсавалася шмат збожжа і ў свірнах.

У саўгасе **«Лютня-Бобрыкі»** пралезлі класава-чужыя элементы. Групай раскрадальнікаў саўгаснай масасці кіраваў тэхнічны дырэктар **Кара-Корбут.** Ячэйка гэтага саўгаса не зможа выкрыць шкодніцкую работу класавага ворага толькі таму, што многія «комуністы» аказаліся ў ліку владзейскай групы. «Комуніст» **Грачоў** на чыстцы адкрыта заявіў: **«Я браў столькі, колькі мне хацелася».** «Комуніст» **Суздалеў,** якому было даручана справесці азімую сяўбу, насенне жыта пакраў, а поле забаранаваў пустым, пасеяўшы толькі па краях кожнага ўчастка зямлі. Трэці «комуніст» **Манукян** — загатчык па спажыўнню, заключыў з Днепрапятроўскім цукавым заводам дагавор на пастаўку 5 тыс. яек і 240 пуд. баранины, у той час, як у саўгасе няма ні курэй, ні авец. Атрымаўшы на заводзе буйную суму грошай у якасці задатка, а таксама 1.800 руб. у саўгасе, Манукян уцёк. Сакратар ячэйкі саўгаса **Вайцэлевіч** не толькі не выкрываў учынкаў сваіх «комуністаў», але, працуючы брыгадзірам, сам дапускаў пры ўборцы жыта да 700 пудоў страт.

Гэтыя факты — толькі невялікая частка шкодніцкай работы пралезлага ў саўгасы і калгасы раёна класавага ворага і яго агентаў — буржуазных перараджэнцаў.

Вялікая засмечанасць выкрыта ў часе чысткі партыйных ячэек культурна-бытавых і навучальных устаноў. У дзіцячых домах «загадвалі» сыны і дочкі папоў, кулакоў, жонкі былых паліцэйскіх. Там панавала поўная безгаспадарчасць, самаспажыванне, разбазарванне прадуктаў. Метадам выхавання было рукапрыкладства ў адносінах да дзяцей.

Сярод выкладчыкаў педагагічнага і фінансава-учотнага тэхнікумаў былі варожыя нам людзі, якія праводзілі антыпартыйныя ўстаноўкі ў выкладанні. Выкладчык фінансава - учотнага тэхнікума **Драздоў** тлумачыў студэнтам сутнасць нацыянал-дэмакратызма, як тэндэнцыю да нацыяналістычных памылак, і зусім змазваў контрреволюцыйную ролю нацыянал-дэмакратызма, як агентуры міжнароднага фашызма. Выкладчык політэхнікума **Марнаў** у сваім рабочым плане па беларускай мове зусім абыйшоў барацьбу з нацдэмаўскімі ўстаноўкамі ў пытаннях мовы. У фінтэхнікуме адзін з выкладчыкаў — агранам раіў студэнтам для прапрацоўкі палітычнашкодную кніжку з кулацкімі «тэорыямі» аб звышпозняй сяўбе ільну.

У навучальных установах зусім слаба разгорнута крытыка і самакрытыка. Не праводзіцца ніякай культурна-масавай работы. Матэрыяльна-бытавое абслугоўванне студэнтаў арганізавана падзвычай дрэнна.

У рабоце каапераціўнай арганізацыі раёна таксама выяўлены глыбокія прарывы. Асноўны з іх — гэта зрыў выканання плана тавараваротa. **Задание чацвертага квартала па тавараабароту выканана толькі на 28 проц.**

У значнай частцы сельскіх каператываў стварыліся вялікія залежы ніходткага асартымента тавараў. У **Пяжаўскім ССТ,** напрыклад, больш трох месяцаў ляжыць 400 шоўкавых кашне і шмат іншых ніходкіх тавараў. Прычыны затаварвання тлумачацца выключна галаванцяскім і нават шкодным плаванаўнем завоза тавараў у ССТ. Выяўлены такія абуракоўныя факты, калі ламтавае шкло палкам аддавалася аднаму ССТ, лампы — другому, а кнаты — трэцяму.

Каапераціўная арганізацыя так сама была засмечана класава-чужымі элементамі. У партыйнай ячэйцы райспажыўтаварыства панавалі п'янства, сямейнасць, бытавое разлажэнне. Уся гэта агідасць рабілася на чале з старшынёй гарспажыўтаварыства **Плоткіным,** старшынёй райспажыўтавыдрыства **Фёдоразым,** загатчыкам грамадскім харчаваннем **Песіным** і старшынёй мясцкома **Дзоркіным.**

Комсомольская арганізацыя раёна знаходзіцца ў падзвычай дрэнным становішчы. Райком комсамола не ведае сапраўднай маёмасці комсомольскіх ячэек і колькаснага складу комсомольскай арганізацыі раёна. На ўлоце лічацца такія ячэйкі, якіх даўно ўжо няма.

Комсомол засмечан класава-чужымі элементамі куды больш чым іншыя арганізацыі. Сакратаром **Забалоцкай** ячэйкі КСМ працаваў сын кулака, выкінутага з калгаса. Шэсць сакратароў калгасных комсамольскіх ячэек — **Каралькоў, Булыгін, Маскалёў, Шумякоў, Адамовіч і Аўсеенка** адданы пад суд за ўдзел у раскрадаванні калгаснай маемасці.

Такое становішча ў комсомольскай арганізацыі стварылася з прычыны адсутнасці цвёрдага партыйнага кіраўніцтва комсомольскімі ячэйкамі як з боку партячэек і парторгаў, так і з боку райкома партыі.

У сістэме работы райкома комсомола ўжываліся пераважна метады камандавання, грубага запіска крытыкі і самакрытыкі. Сакратар райкомола **Ванзель** замест дзелавой работы займаўся арганізацыяй п'янак, у выніку чаго растраціў звыш тысячы рублёў, якія ён узяў з розных устаноў ашуканчым шляхам.

Факты вялікай засмечанасці калгасаў, саўгасаў, совецкіх, каапераціўных і навучальных устаноў, а таксама партыйных ячэек і комсомола гаворыць аб тым, што ў раёне не было належнай барацьбы з класавым ворагам. Райком партыі не толькі не мабілізаваў партыйную арганізацыю на павышэнне рэволюцыйнай пільнасці, а часта сам аказваўся палітычна блізкім, не заўважваў шкоднай дзейнасці класавага ворага. І няма чаго здзіўляцца, калі Мсціслаўшчына на апынулася і знаходзіцца доўгі час на чорнай дошцы за марудлівае выкананне дзяржаўных загатовак, асабліва ільну.

У працэсе чысткі і пасля яе ў раёне таксама яшчэ не выпла са стадыі арганізацыйнага афармлення. Культпроп РК ЛКСМБ тав. **Салега** і сакратар райкомола тав. **Шьферсон** і па сёмешні дзень «складаюць» план зімовай палітвучобы.

Раённая камісія па чыстцы, пад'ёўшы вынікі сваёй работы, указала на недапушчальнасць такога становішча марксістка-ленінскага выхавання кантрарганізацыі і прапанавала РК КП(б)Б прыняць рашучыя меры па разгортванню партыйнай вучобы. Гэтыя прапановы камісіі павінны быць неадкладна рэалізаваны.

Стальноў, Шэшкоў.

„ПРЫЧЫМ ТУТ Я"

— Прычым тут я? За партвучобу нясе адказнасць увесь РК. І са сакратар райкома т. Ізц, і кіраўнік спраў, і іншыя. А я тут новы чалавек. Культпропам працую толькі трохі месяц. Самі падумайце... Хіба-ж магу я ведаць аб усім, ведаць, як у кожнай партячэйцы пастаўлена вучоба... прычым тут я?

Гэтыя словы належаць загадчыку культпропа чэрыкаўскага РК КП(б)Б тав. **Курчанскаму.** Працуючы тры месяцы культпропам. Курчанскі не толькі не ведае становішча партвучобы ў кожнай ячэйцы, але не ведае, колькі ў раёне арганізавана кандыдацкіх школ і які процант партарганізацый ахоплен партвучобай. Курчанскі замест дзелавой работы і канкрэтнага кіраўніцтва вучобай займаецца хіканнем. Таму і не дзіва, што ў раёне больш-менш здальняюча працуюць толькі 2-3 кандыдацкія школы.

У ячэйцы буйнейшага калгаса імя **Карла Маркса** да гэтага часу вучоба яшчэ не пачыналася. Прапагандыст тав. **Трафімаў,** скончыўшы пазамесячныя курсы партактыва пры ЦК КП(б)Б, усё яшчэ «арганізоўвае» кандыдацкую школу, «праводзіць» заняткі слухачоў. Не праводзіцца партвучоба і ў ячэйках калгасаў **Горкаўскага, Езерскага, Вепрынскага, Верамееўскага і Мірагошчанскага** сельсоветаў.

У многіх ячэйках партвучоба арахоплена з перабоямі, без патрэбнай актыўнасці з боку слухачоў. У ячэйцы калгаса імя **Сталіна,** Каменскага сельсовета, на заняткі кандыдацкай школы заўсёды гаворыць толькі адзін кіраўнік тав. **Марозаў.** Ён ад літары да літары чытае падручнік, а слухачы ў гэты час думаюць, як-бы хутчай скончыліся такія «заняткі», або проста спяць.

Павелічэнне заняткаў ва ўсіх школах вельмі дрэннае. Нагадваюць па масавым спазненні. У ячэйцы калгаса **«Кастрычнік»** заняткі пра водзіцца заўсёды са спазненнем на 2-3 гадзіны. На заняткі 26 лістапада ні адзін з комуністаў не з'явіўся.

Аб іншых формах вучобы ў раёне гаварыць не прыходзіцца. Іх зусім няма. Культпроп РК рашыў, каб усе вясковыя комуністы займаліся толькі ў кандыдацкіх школах. **І гэта называецца дыферэнцыраваным падыходам да кожнага комуніста ў паасобку, увагай да ўзроўня яго палітычнай пісьменнасці.**

Комсомольская палітвучоба ў раёне таксама яшчэ не выпла са стадыі арганізацыйнага афармлення. Культпроп РК ЛКСМБ тав. **Салега** і сакратар райкомола тав. **Шьферсон** і па сёмешні дзень «складаюць» план зімовай палітвучобы.

Раённая камісія па чыстцы, пад'ёўшы вынікі сваёй работы, указала на недапушчальнасць такога становішча марксістка-ленінскага выхавання кантрарганізацыі і прапанавала РК КП(б)Б прыняць рашучыя меры па разгортванню партыйнай вучобы. Гэтыя прапановы камісіі павінны быць неадкладна рэалізаваны.

Стальноў, Шэшкоў.

РАЎНЯЦЦА ПА ПАРТГРУПЕ ТАВ. САКОВІЧА

Два пэхі менскага вагона-рамонтнага завода імя **Мяснікова** працуюць у адпаведных умовах, але вынікі іх работы розныя. Гэта тлумачыцца, галоўным чынам, неадпаведнай работай партыйных груп.

Партгрупа цэха па рамонту таварных вагонаў сама па сабе невялікая — усяго 3 чал. Але яна добра кіруе вытворчым працэсам работы і мабілізуе рабочых на выкананне плана. Парторг тав. **Саковіч** (столяр), майстар-вылучэнец тав. **Гладкі** і маляр-комуніст **Шустэр** з'яўляюцца добрымі арганізатарамі на вытворчасці. Яны дабіліся таго, што кожная брыгада і кожны рабочы ведаюць свае штодзённыя заданні. **Перад пачаткам работы, да гудка, рэгулярна кожны дзень праводзяцца 10-мінутныя вытворчыя нарады-«планёркі».** На гэтых нарадах падводзяцца вынікі работы за дзень і прапрацоўваюцца заданні на другі дзень. Кожная брыгада даецца штодзённае пісьмовае заданне, у якім пералічваюцца віды работ і расцэнкі.

Партгрупа не дапускае ні адпаго выпадка парушэння працоўнай дысцыпліны. Кожны факт прагулу, непатрэбнага хаджэння па цэху, а таксама брака абазначана абгаварваецца на вытворчых нарадах. Рабочых, якія адставалі, група брала пад свой непасрэдны нагляд.

У выніку ўсяго гэтага ў цэху ў лістападзе не было ні аднаго спазнення. Брак знізіўся амаль да нуля. Раней адставаўшыя ў выкананні плана рабочыя — **Віткоўскі, Пятроўскі, Жыгалькін** — зараз з'яўляюцца ўдарнікамі. Падцягнуліся ў работе маладыя рабочыя **Шэхаль і Гардзей.**

Вялікую ролю ў павышэнні працоўнай дысцыпліны адыграла соцстаўрніцтва паміж брыгадамі і конкурс на лепшую брыгаду, які праводзіўся на заводзе.

Партгрупа добра арганізавала масава-выхаваўчую работу. Групавы агітатар тав. Шустэр часта праводзіць сярод рабочых чытку газет і гутаркі па міжнародным і ўнутраным тэмы, а таксама правяраў работае з рабочымі ўсе кастаповы партыі.

Асаблівую ўвагу звярнула партгрупа на слабейшы ўчастак — сталярныя работы. Гэты ўчастак быў узят пад пастаянны нагляд самім парторгам Саковічам. Ён сваім прыкладам падцягваў усю брыгаду. Саковіч з'яўляўся ініцыятарам сустрэчнага планавання. Следуючы яго прыкладу, брыгада тав. **Дашкевіча** замест планавых 7-мі вагонаў абавязалася рамонтаваць кожны месяц 9 вагонаў, і гэта задание выконвае. Перавыконваюць план і другія брыгады.

Кастрычніцкі план па цэху ў цэлым выканан на 151 проц. — небывалы факт у гісторыі завода; план лістапада — на 125,4 проц.

Уключаўшыся ў масавы вытворчы паход імя тав. **Гікало** і разгарнуўшы падрыхтоўку да сустрэчы XVII партз'езда, рабочыя цэха па рамонту таварных вагонаў звярнуліся з закліканам да рабочых цэха па рамонту пасажырскіх вагонаў, коваль скага і механічнага цэха браць з іх прыклад. Аднак, вагон гэтага заклікам іншыя цэхі мазавай работы як належыць не разгарнулі і планавыя заданні не выконваюцца.

Усяць, напрыклад цэх па рамонту пасажырскіх вагонаў. Партгрупа гэтага цэха, як кіраўнік вытворчасці не адчуваецца. У цэху частыя спазненні.

У цэху вялікі брак. Амаль не бывае такога вагона, які-б пасля рамонта не вароча ўся на паўторны. **Вось кароткі пералік: вагон № 650 пасля рамонту меў 32 дэфекты, вагон № 4512 — 31 дэфект, вагон № 4517 — 34 дэфекты, вагон № 2564 — 17 дэфектаў.**

Партгрупа на ўсе гэтыя з'явішчы не рэагуе. Сам парторг **Саковіч** часта ўступае ў сварокі з майстрам, не выконвае яго ўказанняў па вытворчых пытаннях.

Па-тэмпаму працуюць партыйныя групы — і розныя рэзультаты іх работы. Ад партгрупы тав. Саковіча трэба вучыцца ўсім партгрупам завода і ў першую чаргу партгрупе цэха па рамонту пасажырскіх вагонаў.

К. Веранэйчык.

УКЛЮЧАЙЦЕСЯ ВА УСЕСАЮЗНЫ СТАЛІНСКІ ПАХОД ІМЯ 17-га ПАРТЗ'ЕЗДА ЗА ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СЫРЦОМ ЛЁГКАЙ І ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

ВЫКЛІК УЗБЕКІСТАНА

МЕНСК. „ЗВЯЗДА" БРАГІНСКАМУ

У «Известия» апублікавана адозва ЦК КП(б)Б Узбекістана ВЦВК, Соўнаркома, палітсэкстара Наркамасла Узбекістанскай ССР з прапановай абвясціць у гонар 17-га з'езда партыі ўсесаюзны сталінскі паход за павелічэнне сырцовых рэсурсаў лёгкай і харчовай прамысловасці.

Правозячы на працягу двух год паход за высокі ўрадкай бавоўны, мы ўключаемся ва ўсесаюзны паход імя Сталіна і шлем вам выклік на ўключэнне ў спаборніцтва.

Шліце вашы меркаванні наконт заключэння канкрэтнага дагавора, маючы на ўвазе скліканне ў Ташкенце ўсесаюзнай нарады спаборнічаючых.

З прывітаннем «ПРАВДА ВОСТОКА» ЧЭРНІК.

УКЛЮЧАЕМСЯ Ў СПАБОРНІЦТВА

Наш любімы правадыр тав. СТАЛІН у сваёй путэрцы з дэлегацыяй лепшых калгасаў Адэшчыны заявіў, што адной з нашых чарговых задач з'яўляецца «ПАДВОЙЦЬ, ПАТРОЙЦЬ ВЫРАБ ПРАДУКТАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ».

Вырашэнне гэтай прадыёзнай задачы стала магчымым дзякуючы тым поспехам, якіх дабілася наша цяжкая прамысловасць у выніку выканання 1-й пяцігодкі за чатыры гады і барацьбы за асваенне тэхнікі. Наша цяжкая прамысловасць мае зараз усе магчымасці задаволіць абстаўленнем лёгкую індустрыю.

Сацыялістычная сельская гаспадарка, нашы саўгасы і калгасы дасягнулі такіх поспехаў, што пры далейшым павышэнні ўраджайнасці, разгортванні і ўздыме прадукцыйнасці жывёлагадоўлі, яны здолеюць цалкам забяспечыць сырцом лёгкую і харчовую прамысловасць.

Калгаснікі Узбекістана пад кіраўніцтвам партыі і палітаддзелаў дабіліся выключных поспехаў у стварэнні ўласнай сырцовай базавуяннай базы для тэкстыльнай прамысловасці Совецкага Саюза.

Гэтыя поспехі даюць права Узбекістану быць вядучай рэспублікай у той вялікай справе, якою з'яўляецца ўсесаюзны сталінскі паход імя 17 партыйнага з'езда за забеспячэнне сырцом лёгкай і харчовай прамысловасці.

Ім па праву належыць ініцыятыва разгортвання соцспаборніцтва рэспублік, краёў і абласцей, вытвараючых сырэц для лёгкай і харчовай прамысловасці па максімальнаму ўздыму ўраджайнасці палёў нашых саўгасаў і калгасаў.

БССР адыгрывае значную ролю ў Совецкім Саюзе па вырабу сырца для лёгкай і харчовай прамысловасці. Мы займаем вялікае месца ў Саюзе па вытворчасці ільнапенькапрадукцыі і выключнае месца па вытворчасці бульбы.

НА ВЫКЛІК «ПРАВДЫ ВОСТОКА» АДКАЗВАЕ ЎКЛЮЧЭННЕМ У СПАБОРНІЦТВА.

Разгарнуць гэта спаборніцтва, зрабіць яго здабыткам усіх саўгасаў, калгасаў, усіх навуковых апратэхнічных працаўнікоў, даследчых інстытутаў і станцый — бавы абавязак усіх партыйных арганізацый, палітаддзелаў МТС і саўгасаў, совецкіх арганізацый і, у першую чаргу, усяго цэнтральнага, раённага, палітаддзельскага і мясцовага друку.

Абвяшчэнне сталінскага паходу імя 17 партз'езда калгаснікі Узбекістана пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый і палітаддзелаў адзначылі выкананнем гадавога плана, вы сокавякаскай бавоўнай.

Наш першачарговы баявы абавязак — ліквідаваць гачебнае адставанне БССР у апрацоўцы і здачы ільну дзяржаве. Неабходным выконваннем плана здачы высокавякаснай ільнапрадукцыі мы павінны адзначыць наша ўключэнне ў конкурс.

Ад зімовай падрыхтоўкі да весенняй пасяўной кампаніі залежыць урадлівай будучага года, залежыць вынікі конкурса-спаборніцтва на вышэйшае ўраджаю нашых палёў, першую чаргу ільну і бульбы.

Партыйныя і совецкія арганізацыі Узбекістана скліканюць на 10 лютага нараду спаборнічаючых рэспублік, краёў і абласцей.

Наша задача — разгарнуць у рэспубліканскае спаборніцтва працаўнікоў, палітаддзелаў, саўгасаў, калгасаў, пад лозунгам — ударнай падрыхтоўкай да веснавой пасяўной кампаніі, барацьбой за павышэнне ўраджайнасці бульбы і ільну, правам пасылкі сваіх лепшых прадстаўнікоў на Усесаюзную нараду ў Ташкент, заваяваннем права работаць 15-му з'езду КП(б)Б, заваяваннем месца на чырвонай дошцы імя 17-га партз'езда».

ЧЫРВОНАПОЛЬСКАЕ КІРАЎНІЦТВА НА ПАВАДУ Ў КУЛАКОЎ

Чаму раён другі год не выходзіць з чорнай дошкі

Чырвонапольскі раён ужо другі год як не выходзіць з чорнай дошкі. З месяца ў месяц, з года ў год у гэтым раёне зрываюцца ўсе важнейшыя кампаніі.

План збожжапаставак выкананы толькі на 93,3 проц.

Бульбапаставкі выкананы на 63 проц.

Асенняя сяўба зацягнута.

Заазблена ўсяго 3.600 га, або 40 проц. плана.

Аб становішчы з засыпкай насенных і страхавых фондаў у раёне ніхто не ведае. Вядома толькі тое, што ні адзін калгас не прыступіў да раз мяркавання фондаў.

Будаўніцтва кароўнікаў і свінарнікаў у калгасах не разгорнута.

Прарывы, літаральна, на ўсіх участках. Асабліва ганебна адстае раён па ільназагатоўках. Гэта самая чорная з чорных плям у раёне. За зрыў здачы дзяржаве ільнавалакна і пляўкі 20 лістапада Чырвонапольшчына заслужана трапіла на ўсебеларускую чорную дошку.

І трэба сказаць, што да чорных дошак тут прывыклі. Занясенне на чорную дошку раённых кіраўнікоў зусім не турбуе. Газета **«Чырвоны сцяг»** нават не палічыла патрэбным перадрукаваць пастанову Цэнтральнай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю, якою Чырвонапольскі раён быў занесен на чорную дошку. Толькі пасля атрымання пастановы рэдакцыя распачала даваць заметкі аб ільну (да гэтага часу не было ні слова).

Райком КП(б)Б, РВК і райаддзяленне Загатільна да 23-25 лістапада ільназагатоўкамі не займаліся. Не займаюцца і зараз. Бюро РК цалкам патурае кулацкаму сабатажу ільназагатовак.

На 8 снежня план здачы ільнавалакна ў раёне выкананы на 6,2 проц. па колькасці і на 4,3 проц. па якасці. Валакна сялянскай апрацоўкі калгасы і аднаасобнікі павінны здаць 1230 цэнт. не ніжэй 8 нумара. Здана ўсяго (у сярэднім 5-м нумарам). 76 цэнт. Ільнатрасты - здана 1400 цэнт.—17 проц. плана. А цяпер на 8 снежня па ўсяму раёну здана толькі 3 цэнт.—0,7 проц. плана. Нецярпіма зрываюць ільназагатоўкі наступныя сельсоветы. Пазушскі — 0,1 проц. плана, **Пачапаўскі**—0,5 проц., **Сабалеўскі**—1,1 проц., **Новаельнянскі**—1,8 проц. плана.

Лён паступае надзвычай марудна. Самы большы прырост за дзень — 0,5 проц.

У чым-жа, урэшце, прычыны? Хто бесперапынна трымае раён на чорнай дошцы? Прычыны толькі ў кіраўніцтве. На чорнай дошцы раён трымаюць не калгасы і не калгаснікі, а раённае і сельскае кіраўніцтва.

— Чаму ў раёне зрываюцца ільназагатоўкі?—пытаемся ў раённых кіраўнікоў.

Адказваюць яны давоўі адпадушна:

Лапацін (сакратар РК КП(б)Б) гаворыць: «У нашым раёне нізкая зямля. І лён і бульба не растуць. Асабліва ў гэтым годзе... Былі вялікія вымачкі. Нерадзяжай... Ільну для здачы дзяржаве не хопіць... Запэўняю вас... Але калі зараз ЦК і «Звязда» на нас НЕ спушчуць, дык як-побудзь, хоць са сказнешнем, план можа і выканаем процантаў на 90»...

Мажэйка (культпроп РК КП(б)Б): План не выканан... Цэнтральнаму камітэту затэлефанавалі толькі зрабіць адно: ліквідаваць наш раён».

Каласоўскі (загс. райсаа): «Прычым тут я. Я лён не зрабіў. Увесь вымак. Ды стараюся асабліва не прыхо дзіцца. Не сёння, дык заўтра, а з работы нас пазнімаюць».

Трывожным фактам трэба лічыць, што Лапацін, Мажэйка і Каласоўскага падтрымлівае ўпаўнаважаны ЦК КП(б)Б т. **Адамовіч.** Ён гаворыць:

— Я прыехай не па ільназагатоўках, а для дапамогі раёну ў правядзенні размеркавання ўрадкаю. Але ільном таксама цікавіўся. І лічу, што задание Чырвонапольскаму раёну за налта вялікае, 1230 цэнт. валакна яны ні ў якім разе здаць не могуць. У іх нізкая зямля...

Так разважаюць у раённым цэнтры, разважаюць кіраўнікі раёна. А што гаворыць у сельсоветах, што гаворыць у калгасах? У сельсоветах і калгасах літаральна паўтараюць слова раённага начальства:

— Ільну няма, лён палнёў, перале жаў, вымак.

Ці праўда гэта, што ў раёне няма ільну?

Не, не праўда. У раёне лён быў і зараз ёсць. Сёлета ў раёне было засеяна 3.214 га ільну. І калі паверыць актам райсаа, што вымакла 1.230 га, дык план можа быць таксама выканан. У раёне, акрамя вымакшага, засталося 3108 га ільну. Пры самым нізкім ураджаі—1,5 цэнт. валакна з кожнага га, планавае задание раён можа перакрыць аж на 300 проц.

Факты—упартая рэч. Ні Лапацін, ні нават Адамовіч пасля гэтага не змогуць даказаць, што ў раёне «няма ільну».

Няма таго калгаса, няма той аднаасобнай гаспадаркі ў раёне, каб не хапіла для здачы дзяржаве ільнавалакна. Ад гэтым гаворыць нават самі калгаснікі. Старшыня калгаса **«Пламя»** тав. **Балбатун** на пытанне, ці праўда, што ва многіх калгасах не хапае ільну, адказвае так: «Лён ёсць і быў у кожным калгасе. Мы, напрыклад, задание выканалі на 89 проц. 15 снежня заканчваем здачу. І трэба сказаць, што ільну шмат застаецца для калгаснікаў».

Або аб чым гаворыць такія факты? У калгасе «Усход Ілічэвіча» (старшыня **Механікай**) траста звалена ў гумно. Страха ў гумне дрэнная. У выніку траста засыпана снегам і ніце. Апрацоўка не распачата. Прычым нельга не адзначыць і таго, што лён ніе ў гэтым калгасе на вачах упаўнаважанага РК КП(б)Б Ерафеенкі. Гніе лён і ў калгасе імя **Варашылава** (старшыня **Высоцкі**). Згніло 2 вазы трасты. А здача ільну не распачата. У калгасе **«Усходняя зорка»** паўтара га ільну пералежала. У калгасе **«Чырвонае поле»** траста знаходзіцца пад адкрытым небам.

І такіх фактаў можна прывесці не калькі дзесяткаў. Усе яны гаворыць аб тым, што ільну ў раёне ёсць немала, што кіраўнікі раёна, партыйных ячэек і сельсоветаў яўна іграюць ільназагатоўкі. Ні РК КП(б)Б, ні райвыканком не прынялі ніякіх мер, каб зламаць кулацкі сабатаж ільназагатовак, каб ударыць па тых, хто злачынна імкнецца сарваць выкананне плана. Райком КП(б)Б патурае кулацкаму сабатажу, кіраўнікі райкома часта становяцца на шлях простай абароны кулакоў.

У Пачапаўскім сельсавеце на ільну аднаасобнікам планы зусім не даведзены. А ў Пазушскім (старшыня **Ткачоў**) аднаасобнікам планы давядзены толькі па трасце. У чыю карысць усё гэта робіцца. Ясна, у карысць кулака.

Або факт са збожжапастаўкамі. У раёне пагналіся за сустрэчнымі планамі. **Відрынскі** сельсавет план збожжапаставак выкапаў на 105,4 проц., **Кажэмяцкі** — на 103 проц. (калгасы 109 проц., а аднаасобнікі — 93 проц.). **Пачапаўскі**—101,1 проц. У **Глінішчым** сельсавеце калгасы выканалі план паставак збожжа на 118,2 проц., а кулакі на... 21,2 проц. Раённая газета «Чырвоны сцяг» (рэдактар **Васіпеўскі**) за мест таго, каб у пух і прах разбіць гэты кулацкі манеур, адкрыта дапамагае парушаць у сельсоветах і калгасах дырэктыву партыі і ўрада. У нумары 109 за 2 снежня газета піша: «Калгасы пашага раёна план збожжапаставак на 30 лістапада 1933 г. выканалі на 101,1 проц. Гэта перамога на фронце збожжапаставак калгасамі атрымана толькі дзякуючы правядзенню райпартарга нізацыяй палітычна-масавай работы...»

Або ўзяць жывёлагадоўлю. У калгасах **«Фрайгат», імя Войкава, «Новы шлях»** і інш. не хапае кармоў. У калгасе **«Совецкая Беларусь»** не хапае сена на цэлых тры месяцы, а загатчык МТФ **Дзюбенаў** пра гэта яшчэ нават і не падумаў.

Загатчык райсаа Каласоўскі заяўляе: «Я ў раёне новы чалавек, працую толькі дзесяты месяц,—заяўляе ён.—Жывёлу чорт не возме, у мяне ёсць больш трох ожных справы. Конь вунь дагледаюцца дрэнна, ад чаго шмат ўпадка. Ды на скаргі сялян таксама трэба даваць адказы, у мяне іх валяцца сотні чатыры...

Загатчык райжывёлаб'яднання **Латышоў** усе сілы прыкладае на тое, каб утаіць гэтыя агідныя факты, гэтыя агідныя адносіны да жывёлы і каня. Ён утойвае нават і тое, што па раёну ў выніку дрэннага догляда нядаўна прапала больш тысячы свіней. І жывёлагадоўля, і ільназагатоўкі ў раёне пра ходзяць дрэнна толькі таму, што няма барацьбы з кулаком, што кулакі ва многіх калгасах нават стаяць на чале кіраўніцтва.

Возьмем калгас **«Чырвоны будаўнік»,** які знаходзіцца ў прарыве ўжо каторы год. Там кулак **Аўраменка Іван** да ўступлення ў калгас трымаў па некалькі батракоў (канкрэтна, Зайцава Б., Бандарава З., Лапунцвіна, Саронкава і інш.). Вясной гэты кулак у калгасе кіраваў справамі аховы бульбы, больш паловы якой ён разам з іншымі кулакамі раскраў. Праўленне калгаса склала акт і справу перадала ў суд. Але ні суд і ні праўленне канкрэтнага нічога не зрабілі. Аўраменка і па сёмешні дзень у калгасе «наводзіць парадкі».

Намеснік старшыні і брыгадзір гэтага калгаса **Сергіенка Г.** — сын кулака, бацька якога і сёння эксплуатуе батракоў, плаціць 450 руб. палатка—таксама арудуе ў калгасе.

Старшыня калгаса **«Мэрис»,** Пазуласкага сельсавета, **Дуброўка П.** патрымаў у калгасе усіх сваіх сваякоў-кулакоў. Кулака **Дуброўку Сяргея** ён нават арабіў сваім намеснікам.

Гэтаму кулацкаму сваволю ў калгасах Чырвонапольшчыны раённае кіраўніцтва патурае, а вельмі часта бярэ пад сваю непасрэдную абарону. Кулак Башкіраў агульным сходам выключаны з калгаса **«Новы шлях»** (Казэмяцкі сельсавет). Ён абскарджаў у сельсавет. Сельсавет пастанову калгаса пацвердзіў. Парт'ячэйка таксама. Кулак Башкіраў убачыў, што нічога не выйдзе, у калгасе яго не адновяць. Ён пачаў прасіць у старшыні сельсавета **Емельяненкі** і сакратара ячэйкі КП(б)Б **Лявуса,** каб яны далі яму такую даведку, з якой ён мог-бы паехаць у Данбас. Сельсавет і парт'ячэйка адмовілі. Кулак пашоў з скаргай да старшыні РВК **Кірэева.** Тут таксама ён нічога не дабіўся. Башкіраў пашоў да сакратара РК КП(б)Б Лапаціна. І Лапацін дае Емельяненку загад: «Зараз-жа выдаць даведку Башкіраву, у якой напісаць, што ён не кулак, а заможны серадняк». Кулак Башкіраў паехаў у Данбас.

РКК-РСІ выявіла, што ў клімакайскай міжраённай базе працуе чырвонапольскі кулак **Благадзераў.** Быў зроблена адпаведнае паведамленне Клімавічы. Там яго зараз-жа зняслі з работы. Благадзераў, ужо ведаючы «добрасць» Лапаціна, адразу пашоў да яго са скаргай. Лапацін даў яму нараду паскарэйшага на міжраённую базу і чырвонапольскую РКК-РСІ у ЦК.

Або вось такі факт. З месцавага совета чырвонапольскага пранала сына гандляра **Левіна,** бацька якога раней меў млын і **Лапацін** прасаваў старшыні совета тав. **Дымшыс** перагляд пастановы РКК на прадыдуме стальковага совета і «калі ніяк страшнага няма—адмаўляць».

У Чырвонаполлі гэта ўвайшло ў сістэму. Усе кулакі і іншыя клас-варожыя элементы ходзяць Лапаціна шукаць абароны.

Кіраўніцтва Чырвонапольскага раёна ўсё пазіцыі здалі кулаку. І тоба з усёй сілай сказаць, што Чырвонапольскі раён будзе ў прарыве да таго часу, пакуль партарганізацыя не разгорне барацьбы супроць кулакоў і іх агентаў, пакуль на ле раёна не будуць пастаўлены праўдзівыя большэвікі.

В. СТАЛЬНОЎ.

Чырвонаполье, 2-9 снежня.

ДАГАВОР СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ПА ЛІКВІДАЦЫІ БЕЗДАРОЖЖА—ДАВЕСЦІ ДА ШЫРОКІХ МАС

7 снежня ў г. Чэбаксары на Усечувашскім з'ездзе ўдарнікаў дарожнага будаўніцтва заключан дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва па ліквідацыі бездарожжа (памёж Чувашскай АССР, БССР, Ленінградскай, Кіраўскай, Уральскай, Заходняй і Іванаўскай абласцямі, Татарскай АССР, Марыйскай і Удмуртскай аўтаномнымі абласцямі, Ніжэгарадзкім краем і ЦЧВ. Ніжэй мы прыводзім канкрэтныя пункты гэтага дагавора.

1.

На працягу 1934 і 1935 гадоў у асноўным ліквідаваць на тэрыторыі рэспублікі (краю або вобласці) прасёлкі на міжраённых пуцях, на ўсіх адказных унутрыраённых шляхах і на пад'язных пуцях к станцыям чыгункі, к прыстанням, элеватарам, калгасам, саўгасам, МТС, к крыніцам сырца (будаўнічым, бураковым раёнам і г. д.), к азёрам будматэрыялаў, пабудаваўшы ўзамен іх пра філіраваныя палепшаныя дарогі, а на найбольш прузанапружаных участках — пакрытыя цэрдай або зежай.

Усе маючыяся і новабудуемыя дарогі агульнасаюзнага, рэспубліканскага, краёвага, абласнога або раённага значэння, незалежна ад іх тыпа, мы абавязуемся ўтрымліваць у поўнай спраўнасці.

Асобую ўвагу звярнуць на правільную пабудову мастоў і пад'ездаў да іх.

Ператварыць усе сельскія і пасёлкавыя вуліцы во ўзорныя ўчасткі дарог па іх дабрабыту, чыстаце і ўтрыманню, прыцягваючы да гэтай работы ў першую чаргу саветы і мясцовыя нізавыя сельскія калектывы аўтадарожцаў.

2.

У новым характары вытворчых адносін, у соцспаборніцтве, ударніцтве, знойдзены і новыя формы сувязі мых адносін да працы, перапварэнне ня ў справу гонару, справу славы, справу доблесці і геройства.

Гэтыя метады, шырока скарыстаныя, прынясуць хуткую і рашучую перамогу і ў схватцы в вежавым бездарожжам. Лепшым прыкладам таму — Чувашыя.

Таму толькі тая рэспубліка (край або вобласць) зможа выйсці на першае месца ў сапраўдным спаборніцтве, якая здолее ўцягнуць у актыўную барацьбу з бездарожжам усе без выключэння партыйныя, совецкія, грамадзкія арганізацыі і шырокія масы працоўных горада і вёскі.

Не марудзячы ні адной мінуты, трэба разгарнуць масавую растлумачальную работу не «наогул» аб карысці добрых дарог, а кусім канкратную ў кожным даным месце, шырока скарыстоўваючы для гэтага хаты-чытальні, чырвоныя куткі, калектывы Аўтадора, радыё і г. д. Арганізуючы спаборніцтва памёж раёнамі, а ўнутры іх — памёж сельсоветамі, калгасамі, саўгасамі і МТС, скарыстоўваючы вопыт перадавых у дарожным будаўніцтве рэспублік, краёў, абласцей, раёнаў і сёл, забяспечваючы жывое канкрэтнае кіраўніцтва спаборніцтвам, можна дабіцца перамогі.

3.

Наступіўшы зімовы сезон цалкам вырашае поспех дарожнага будаўніцтва 1934 года. Таму кожны, уступіўшы ў спаборніцтва, абавязуецца максімальна скарыстоўваць зіму для падрыхтоўкі да летняга разгортвання будаўніцтва і правядзення тых будаўнічых работ, якія могуць быць выкананы зімой.

Перш за ўсё паўнасцю быць распрацаваны канкрэтныя планы будаўніцтва і давядзены да кожнага сельсовета, калгаса, МТС, саўгаса, дарожнай брыгады, двара.

Зімовы перыяд — найбольш спрыяльны час для арганізацыі вучобы, таму арганізаваць курсы для перападрыхтоўкі дарожных майстраў і тэхнікаў курсы для падрыхтоўкі дарожных арганізатараў і ўпаўнаважаных, арганізацыя вучобы дарожнага актыва ў калектывах Аўтадора і г. д. з'яўляецца не менш важнай за задачай спаборнічаючых.

Цэнтральныя месцы ў зімніх работах займаюць загатоўка і вывазка будаўнічых матэрыялаў: лес, камень, прагін, пясок. Заданне ўрада — загатовіць і вывезці да месца работ да 1 красавіка 1934 года не менш 75 проц. будматэрыялаў плана і на быць выканана безагаворачна.

Забяспечыць свае са льда, будаўніцтва мастоў, загатоўку стандартных деталей мастоў і другіх штучных дарожных будынкаў (у адпаведнасці з плянамі), поўны рамонт усіх маючыхся дарожных механізмаў, — усё гэта спаборнічаючыя абавязуюцца правесці на працягу зімовага перыяда.

4.

Скарыстоўваючы зімовы перыяд 1933-34 года і ў далейшым зімовы перыяд 1934-35 года для інтэнсіўнага разгортвання вучобы і падрыхтоўкі кадраў, спаборнічаючыя не могуць, аднак, абмежаваць задачу стварэння кадраў дарожнікаў работай над гэтым пытаннем толькі ў зімовыя месяцы. Барацьба круглы год за дарожныя кадры, асабліва за нацыянальныя кадры, за павышэнны рост іх тэхнічнай узброенасці, за стварэнне магутнай арміі дарожнікаў вышэйшай, сярэдняй і ніжэйшай кваліфікацыі з'яўляецца адным з важнейшых абавязацельстваў спаборнічаючых.

5.

Асобае значэнне пры падрыхтоўцы шырокага будаўніцтва дарог набывае пытанне аб механізацыі. Цудартрансу СССР, галоўдартрансы саюзных рэспублік, ЦС Аўтадора, дарожныя і аўтадарожныя арганізацыі спаборнічаючых рэспублік (краёў і абласцей) абавязуюцца прыняць усе меры як да пашырэння вытворчасці і свайчасовага выканання заказаў на складаныя дарожныя механізмы, вырабляемыя на саюзных заводах, так і да наладжання іх вытворчасці на заводах мясцовага значэння. Змагаючыся за пашырэнне тэхнічнай базы дарожнага будаўніцтва за кошт стварэння новых механізмаў, спаборнічаючыя бяруць адначасова на сябе абавязацельства забяспечыць высокую якасць рамонта ўсяго наяўнага механічнага інвентара.

Акрамя гэтага, буйнейшай задачай у галіне тэхнічнай узброенасці дарожнага будаўніцтва з'яўляецца разгортванне масавага выраба больш простых дарожных знарадаў (канавакапацелі, уцюгі, калёі, конныя лапаты) на мясцовых прадпрыемствах і будаўнічых дарожных дварах у кожным раёне для снабжэння імі калгасаў, сельсоветаў і г. д. Задача гэта павінна быць вырашана ва што-б тані стала.

Для выраба гэтых дарожных знарадаў спаборнічаючыя павінны прыцягваць насельніцтва ў парадку працоўнага ўдзела.

Надзвычай вялікае значэнне для паскарэння будаўніцтва мае магчымая большае прыцягненне к дарожным работам механічнай цягавай сілы з МТС, соўгасаў і калгасаў. Спаборнічаючыя абавязаны загадзя распрацаваць план прыцягнення да работ трактараў, дабіўшыся ўнясення сваіх намётак у вытворчыя планы трактарных паркаў і поўнага ўкарыстання іх на гэтай лініі. Акрамя гэтага, спаборнічаючыя павінны дабіцца максімальнага ўдзела ў дарожных работах механічнага транспарта соўгасаў, калгасаў і МТС.

6.

Да гэтага часу ў большасці рэспублік, краёў і абласцей працоўныя рэсурсы насельніцтва, прыцягваемыя ў парадку закона аб працоўным удзеле, скарыстоўваліся далёка не поўнасцю, пры чым вельмі шырока практыкавалася замена працоўнага ўдзела грашовымі ўзносамі.

Гэта паказвае неразумнае самога сэнса закона аб працоўным удзеле, які мае мэтай не толькі скарыстоўваць працу насельніцтва на пабудове той ці іншай дарогі, а і прыцягнуць яго ўвагу да барацьбы з бездарожжам, зацікавіць яго гэтай работай. На ніганцкіх прасторах Краіны Совецкай, якія-б грашовыя сродкі мы ні мелі, ніколі паспяхова не перамагчы бездарожжа, калі за гэту справу не возьмецца само насельніцтва. Таму спаборнічаючыя павінны так распрацаваць аб'екты, план і метады працоўнага ўдзела на сельніцтва ў дарожным будаўніцтве, так падабраць кадры кіраўнікоў, так правесці падрыхтоўчую палітыка-асветную работу сярод сялянства, каб працоўны ўдзел выліўся ў форму свядомага шахода насельніцтва на бездарожжа.

Поўнасцю скарыстаць рэсурсы працоўнага ўдзела, дапускаць замену грашовымі ўзносамі толькі ў самых выключных выпадках.

Побач з пералічанымі задачамі ў справе прыцягнення насельніцтва да працоўнага ўдзела па будаўніцтву дарог, спаборнічаючыя абавязуюцца забяспечыць высокую якасць будаўніцтва дарог з працоўным удзелам і ўкладзіць у месячны тэрмін у дапаўненне да гэтага дагавора маючыяся нормы выпрацоўкі на працадзень, каня-дзень, трактара-дзень, аўтамабіля-дзень па ўсіх відах дарожных работ, узгадняючы гэтыя нормы з той практыкай, якая ёсць у рабоце перадавых калектываў працаўнікоў-дарожнікаў.

Прыцягненне насельніцтва да працоўнага ўдзела на будаўніцтву дарог было і будзе ўчасткам застрэйшай класавай барацьбы. Рашучае выкрыццё прошуткеў рэштак кулацтва, прабуючых дэзарганізаваць работу на будаўніцтве, безумоўнае выкананне заданняў па працоўнаму ўдзелу кулацкімі гаспадаркамі, — вось за што спаборнічаючыя будуць змагацца з асобай сілай і непрымірымасцю.

Але класавы вораг, кулак, будзе прабаваць шкодзіць не толькі ў справе прыцягнення да працоўнага ўдзела насельніцтва. Мы павінны памятаць, што не выключана магчымасць пранікнення ворага і ў наш дарожны апарат, у асаблівасці нізавы, не выключана магчымасць спроб псаваць дарожны механічны інвентар і т. д. «Вось чаму рэвалюцыйная пільнасць з'яўляецца той самай якасцю, якая асабліва неабходна зараз большэвікам» (Сталін). І мы, спаборнічаючыя, даем абавязацельства быць пільнымі да канца.

7.

Барацьба за зніжэнне каштоўнасці будаўніцтва, за палепшанне якасці, за паскарэнне тэмпаў з'яўляецца адной з асноўных задач спаборнічаючых. І вырашыць гэтую задачу толькі шырокае скарыстанне навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі, стандартызацыя, вынаходніцтва і рацыяналізацыя працы ў справе дарожнага будаўніцтва. Гэта становіча абавязвае спаборнічаючых пашырыць навукова-даследчую работу на прыстасаванню новых мясцовых будаўнічых матэрыялаў, палепшанню рацэптаў сумесяй, па арганізацыі вывучэння будаўнічага вопыта, яго сістэматызацыі і ўзаемаабмену. Трэба павесці рашучую барацьбу супроць тэхнічнай адсталасці, косасці, кансерватызма, разгарнуць рацыяналізатарскую работу, для якой будаўніцтва дарог — непачаты край.

Тут ва ўсёй гэтай рабоце, у дасягненні высокай якасці нашых дарожных будынкаў, у зніжэнні каштоўнасці будаўніцтва, пашырэнні тэмпаў вялікую ролю адыгрываюць камандзіры дарожнага будаўніцтва: інжынеры, тэхнікі, дарожныя майстры. Улічваючы значэнне іх работы, спаборнічаючыя рэспублікі, краі і вобласці бяруць на сябе абавязацельства ўцягнуць у спаборніцтва майстраў дарожнай справы, узмацніць у працэсе спаборніцтва вырошчванне новых кіруючых кадраў, смела высоўваючы для гэтага на адказную работу праявіўшых сябе талантлівых людзей, адначасова паляпшаючы іх культурна-бытавыя ўмовы.

8.

Але мала толькі пабудаваць дарогу, — трэба арганізаваць за ёю пастаянны дагляд, вытвараць рэгулярны рамонт, абсталяваць яе, вытварыць абаронныя пасадкі. Таму зараз-жа не традучы часу, спаборнічаючыя абавязаны ліквідаваць бяспрытульнасць існуючых дарог, шляхам разбўкі на ўчасткі і прымацаваць іх да суседніх калгасаў, соўгасаў, сельсоветаў, МТС і г. д. для барацьбы са снегазымі заносамі, для пастаяннага дагляду і абсталявання. Сярод шырокіх мас працоўных вёскі неабходна правесці растлумачальную работу, што дарогі гэта — сацыялістычная маемасць, што ахова дарогі і лесапасаджэнняў, іх дабра быт, ахова ад снежных заносаў ёсць ахова свяшчэннай, недатыкальнай сацыялістычнай маемасці.

Спаборнічаючыя абавязаны распрацаваць план прымацавання раней пабудаваных дарог і тых, якія будуць пабудаваны ў 1934 годзе, а ў далейшым і ў 1935 годзе.

9.

Да моманта масавага разгортвання работ спаборнічаючыя павінны арганізаваць культурна-бытавое абслугоўванне, стварыўшы на вялікіх аб'ектах, з вялікай колькасцю рабочых, інтэрнаты, месца начлега, медычныя пункты, кіно-сеансы, тэатральныя пастаноўкі, перасоўныя бібліятэкі, снабжэнне газетамі, перасоўныя ларкі з харчаваннем і тавамі шырспажыва, перасоўныя медычныя брыгады і г. д. Натуральна, што пытанне харчавання і забеспячэння фуражом застанецца нежашчэўленым, калі за гэта як след не возьмуцца ўсе мясцовыя дарожныя (уключаючы раённыя) арганізацыі — за стварэнне ўласных фуражных і харчовых баз. У гэтым пытанні многа могуць даць умелая мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў дарожных арганізацый, ініцыятыва, большэвіцкая настойлівасць. Але справа тут не толькі за дарожнымі арганізацыямі. На дапамогу спаборнічаючых абавязуюцца прыцягнуць у арганізацыю, Нарпіт, Наркамснаб, Наркамаховы здароўя, Наркамасветы, — усіх, чыя дапамога і падтрымання дадуць магчымасць больш паспяхова вырашыць гэта пытанне.

10.

Спаборніцтва рэспублік, краёў і абласцей немыслімае без дапамогі грамадзкасці і асобе ЦС Аўтадора і яго мясцовых арганізацый, без прафсаюзаў, комсомола, якія заўсёды былі застрэльшчыкамі ў дарожным спаборніцтве, урэшце, без дапамогі друку, без арганізацыі шэфства перадавых прадпрыемстваў, палітгадзеляў МТС, соўгасаў, пад шаефскімі будаўніцтвамі.

Паспяховае спаборніцтва немыслімае без пастаянных уважлівых адносін да дарожнага будаўніцтва ўсіх мясцовых партыйных арганізацый, палітгадзеляў і совецтаў.

Рэспублікі, краі і вобласці, уступаючыя ў спаборніцтва, абавязуюцца арганізаваць усямерную садзейнасць і пастаянную тэхнічную дапамогу сваіх цэнтральных дарожных арганізацый нізавым звеншам дарожнага апарата, раённым, сельскім саветам.

Мясцовыя, партыйныя, совецкія арганізацыі дагаварваючыхся рэспублік, краёў і абласцей бяруць на сябе абавязак нястомна сачыць за ходам спаборніцтва, накіроўваць яго, дапамагаць яму.

11.

У дадатак да гэтага агульнага дагавора ўступаючыя ў спаборніцтва рэспублікі, краі і вобласці падпісваюць сацыялістычныя абавязацельствы з дакладнымі выгорнікамі аб'ёмных, якасных заданняў і тэрмінаў пасаобных работ. Цудартранс СССР і галоўдартрансы абавязуюцца на працягу месячнага тэрміна спусціць на месца планы будаўніцтва, удакладніць ліміты і г. д., на аснове якіх спаборнічаючыя складаюць свае канкрэтныя абавязацельствы.

12.

Для нагляда за ходам спаборніцтва і выканання дагавораў у радкомы «Известий ЦИК СССР и ВЦИК» ствараецца спецыяльная камісія ў складзе прадстаўнікоў Цудартранса СССР, галоўдартрансаў, ЦС Аўтадора, прадстаўнікоў спаборнічаючых рэспублік, краёў і абласцей, комсамола, ВЦСПС і рэдакцыі «Известий», якая праводзіць праверку дагавора з апублікаваннем вынікаў спаборніцтва ў газеце не радзей чым раз у квартал.

Канчатковае вырашэнне рэзультатаў спаборніцтва за 1934 г. выносіцца 1 лютага 1935 г.

Першая праверка аб выкананні работ узімку 1933-34 г. праводзіцца 1 сакавіка 1934 года.

Для прэміявання спаборнічаючых рэспублік, краёў, і абласцей рэдакцыя «Известий» устанаўляе чырвоны пераходны сцяг імя «Известий ЦИК СССР и ВЦИК». Сцяг прысуджаецца пакварталыа.

13.

Для прэміявання спаборнічаючых ствараецца таксама грашовы фонд, першапачаткова ў суме аднаго мільёна рублёў, на набыццё аўтамабіляў, трактараў, веласіпедаў і г. д. для калектыўнага і індывідуальнага прэміявання ўдзельнікаў спаборніцтва.

ДАЦЬ КРАІНЕ БОЛЬШ ТАВАРАЎ ВЫСОКАЙ ЯКАСЦІ

УСЯМЕРНА УЛІЧВАЦЬ УЗРОСШЫЯ ПАТРАБАВАННІ ПРАЦОЎНЫХ, НАСТОЙЛІВА ЗМАГАЦЦА ЗА ЯКАСЦЬ АСАРТЫМЕНТА—АБАВЯЗАК ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ І ГАНДЛЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Выканаць указанне тав. Сталіна

(На нарадзе трыкутнікаў пры «Звяздзе»)

Абяцанне тав. Сталіна адасіям калгаснікам выпусціць удвая і ўтрая больш тавараў шырспажыва, пастанова пленума ЦК ВКП(б) аб скліканні XVII з'езда ВКП(б) і склікание XV з'езда КП(б)Б — знайшлі шырокі водгалас сярод усіх прадпрыемстваў БССР.

Ужо няма амаль ні аднаго прадпрыемства, якое не запялося-б выяўленнем сваіх вытворчых магчымасцяй. Гэта з усёй відавочнасцю даказалі і ўдзельнікі нарады трыкутнікаў прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці і прамкааперацыі, скліканай «Звяздой» і Беладдзялеем «Легкой индустрии».

ЯШЧЭ МАЦНЕЙ БАРАЦЬБУ ЗА 420

Шэйная фабрыка «Кастрычнік» у Менску зусім правільна аразумела ўказанні т. Сталіна аб павялічанні тавараў шырспажыва. Фабрыка ідзе па шляху выяўлення ўсёй вытворчай патэнцыяльнасці прадпрыемстваў. Упор узят у першую чаргу на ўпчышчэнне рабочага дня.

Устаноўлена, што фабрыка траціць на раздачу газет у часе работы, непатрэбныя гутаркі, нарэшце, на нагрэў ушогоў і падрыхтоўку на пачатку работы каля 13 проц. рабочага часу. Пад рубрыку «вытворчыя непаладкі» адносяць усякія прастоі, якіх, безумоўна, можна ўнікнуць. У гэтую-ж рубрыку адносяць пяўмеане паладзіць тэхналагічны працэс.

Фабрыка ўстанавіла, што каэфіцыент карыснага дзеяння машын дасягае не больш 50 проц. І калі да весці яго хоць-бы да 80 проц. і некалькі ўпчышчэнь рабочы дзень, то гэта дасць фабрыцы новай прадукцыі на 2½ млн. руб. у год.

Дырэктар фабрыкі т. Гарэлік узняў не менш важнае пытанне.

— Ці трэба адносіць за кошт фабрыкі пяцімінутныя перапынкі?

Да гэтага часу на калдагавору гэтыя перапынкі былі адносены за кошт фабрыкі. Памножыўшы гэтыя мінуты па мову прадукцыі, фабрыка, па-першае, ніколі не можа дасягнуць 420-мінутнага рабочага дня. Апрача таго гэта з'ядае вялікую колькасць прадукцыі. Пры 7-гадзінным рабочым дні пытанне аб перапынках за кошт адміністрацыі можа быць пераглядзана.

Аналагічнае становішча (пеўпчышчэнны рабочы дзень, нятоўнае выкарыстанне абсталявання) мы наглядаем і на шэйнай фабрыцы імя Крупскай. Павялічэнне выпуска прадукцыі таксама можа ісці за кошт унутрыфабрычных мерапрыемстваў.

Упарадкаванне тэхналагічнага працэса дае магчымасць устанавіць поўную істужку і гэта каля мільёна прадукцыі ў год. Замена часткі машын больш высокім класам дасць 300 тыс. руб. Супроць намётак трэста прадпрыемства ў стане даць, такім чынам, на 9 проц. больш задання па павышэнню прадукцыйнасці працы.

БЕЗ КАПІТАЛЬНЫХ ЗАТРАТ

Некалькі іншае становішча ў скуранай прамысловасці. Завод «Большэвік» у 1933 годзе выкарыстоўвае толькі 80 проц. сваёй вытворчай магутнасці. Калі планавая (тэхнічна прадзельная) магутнасць «Большэвіка»—120 млн. дэцыметраў скуры, то плян 1933 года быў складзен толькі на 95 млн. дэцыметраў.

Завод без асаблівага напружання можа павялічыць праграму. Акрамя таго, незначныя затраты на ўнутрыцэхавое абсталяванне можа павялічыць праграму да 30 проц.

Амаль такое-ж становішча і па мешкавай абутковай фабрыцы, якая намецілася ў 1934 г. павялічэнне выпуска прадукцыі на тыя-ж 30 проц.

Мы чулі цікавыя даныя ў сэнсе вытворчых магчымасцяй на валу асобных, здавалася-б маламоцных прадпрыемстваў.

Галантарэйная фабрыка імя Фрунзе, вытворчая праграма якой у 1934 г. усяго 3½ млн. руб., здольна без усякіх новых капітальных укладанняў даць паляўнасці сырца (галаліта) павялічыць сваю праграму ў 5-6 раз. Трэба сказаць, што гэта фабрыка, як база для шэйнай прамысловасці (гузікі) і выраба тавараў шырспажыва (грэбні), пачне набываць вялікую вагу ў беларускай і нават у саюзнай лёгкай прамысловасці.

Другое прадпрыемства—пічацінная фабрыка імя Крупскай па выпуску бартавога воласа (зараз вельмі дэфіцытнага паўфабрыката для шэйнай прамысловасці) можа ў 1934 г. падвоіць выпуск гэтага віда прадукцыі.

ПАЧАКАЕМ, ШТО СКАЖА МАСКВА

Нельга абысці маўчаннем наўпасць сярод некаторых кіраўнікоў трэстаў і прадпрыемстваў боязні і лішняй асцярожнасці...

На нарадзе пры радыцыі выступіў прадстаўнік шэйтрэста. Ён не мог казаць нават арыентовачнай лічбы павялічэння выпуска прадукцыі.

— Пачакаем, што скажа Масква.

Гэта ў той час, як прадпрыемствы трэста тут-жа на нарадзе давялі яркія ўзоры сваіх вытворчых магчымасцяй.

— Нас лімітуе сырэц—прабаваў ён адказаць на настойлівыя пытанні.

— Пачакаем, што скажа Масква.

Прадстаўнік сампрамкааперацыі з боязні не сказаць лішняга прыводзіў таблицы павялічэння выпуска прадукцыі па асобных відах. Агульны рост вызначан у 37 проц. І характэрна, калі закранулі пытанне аб вырабе мыла, то тут наметка сампрама такая. Калі ў 1933 г. было выпушчана мыла на 240 тыс. руб., то ў 1934 г. плануецца выпуск на 270 тыс. руб. Павялічэнне толькі на 30 тыс. Тут-жа на нарадзе, пасля рада пытанняў, прадстаўнік сампрама вымушан быў заявіць.

— Па сутнасці мы можам павялічыць выпуск у два разы. Галоўнае—сырэц.

Мы даволі добра ведаем (ужо па ранейшай нарадзе мылаваравў), што сампрамкааперацыя дрэнна загатоўляла сырэц і высоўваць гэта, як прычыну для зніжэння праграмы—гэта значыць не хацець даць краіне тое, што прамысловасць можа даць.

АСАРТЫМЕНТ І ЯКАСЦЬ

Рэалізацыю ўказанняў тав. Сталіна аб пашырэнні выпуска прадукцыі шырспажыва нельга ні ў якім разе адрываць ад значнага і алчуальнага палепшэння якасці прадукцыі і асартымента. Узросшыя патрэбы калгаснай вёскі і рабочага горада датычаць не толькі колькасці, але і якасці.

Правільна ўсвоіла гэту ўмову шэйная прамысловасць. Да гэтага часу асартымент жаночага паліто не выходзіў з рамак трох фасонаў, па мужчынскаму касцюму—1-2 фасоны, па дзіцячаму асартыменту — 2 фасоны. Зараз колькасць фасонаў па жаночаму паліто будзе даведзена да 19, па мужчынскаму касцюму—да 6-7, па дзіцячаму—5-6. Нават «галстоўка», якая да гэтага часу шылася толькі па адному шаблону, будзе мець 3-4 фасоны.

Абутковая прамысловасць раней адмовіцца ад вінтавога змацавання падошвы. У 1934 г. фабрыка пяройдзе на прашыўны абутак. Гэта, безумоўна, дасць свае адчувальныя рэзультаты для паляпшэння якасці бацінкаў.

Не менш цікавае пытанне высуну та нарадай, глыбока закранаючае якасць прадукцыі. Гэта адносіцца да шпалернай вытворчасці.

— Трэба адмовіцца ад старых малюнкаў і бязгустоўнай расфарбоўкі шпалер.

Фабрыка імя Вароўскага сёе-тое робіць у гэтым напрамку, але лічэ змелса і перапуча.

Гэта таксама адносіцца і да «кап ферэнцыяў мод», якія таксама склаліся шэйнікамі. Фасоны і моды ўстанаўлялі каператары і абытавыя арганізацыі. Голаса рабочага і калгасніка—спажыўца прадукцыі шэйнай прамысловасць не чула.

Шырокія канферэнцыі спажыўцоў, выстаўкі фасонаў у горадзе і перасоўныя ў вёсцы, выезды для вывучэння попыта і густа ў калгасах—вось шлях, па які шэйная прамысловасць павінна стаць.

Нарада пры «Звяздзе» даказала з усёй відавочнасцю, што лёгкая прамысловасць і прамкааперацыя Беларусі маюць усе магчымасці поўнасцю выканаць указанне тав. Сталіна і павялічыць удвая і ўтрая выпуск тавараў шырспажыва.

Б. Род.

Гандляваць культурна, па-совецку

Перад намі ліст праўлення калгаса «Чырвоны бацц», Вязуеўскага сельсовета, Рэчыцкага раёна, да старшыні Белкаапсаюза. Гэты кароткі ліст заслугоўвае ўвагі. Ён наглядна паказвае, якія каронныя зрухі адбываюцца ў калгасным вёсцы, якія адказныя абавязкі накладваюць яны на ўсе нашы арганізацыі. Вось гэты ліст:

«ПАТРАБАВАННЕ

Просім не адмовіць у нашым хадайніцтве выслаць для нашага калгаса 15 індывідуальных талонаў на зімовае паліто для нашых лепшых ударнікаў, для ўзняцця ініцыятывы ў нашым калгасе. Наш калгас усе абавязацельствы перад дзяржавай выканаў. Просім выслаць талоны і ўказаць, дзе можна атрымаць паліто: у Гомелі ці ў Рэчыцы. Дайце ўказанні, каб можна было атрымаць паліто па заказу».

Заможнасць прышла на калгасны двор. Няўхільна расце попыт калгасніка. Вёска патрабуе зараз такіх тавараў, якіх нікалі раней не бачыла сялянская сям'я.

У гэтых умовах разгортванне культурнага совецкага гандля на вёсцы, хутчэйшая адгрузка тавараў шырокага спажывання набываюць вялікае значэнне.

Гэтым пытаннем была прысвечана нарада каператыўных і прамыслова-збытавых арганізацый, якая адбылася 11 снежня.

Нарада паказала, што нашы гандлёвыя арганізацыі не ўлічылі новых абставін на вёсцы, не одолелі так перабудаваць работу, каб лепш задаволіць узросшыя патрабаванні рабочых і калгасных мас.

План таваразвароту па спажывецкай каператыўі БССР за 4 квартал выкананы да 1 снежня на 61 проц. Горад і вёска недаатрымалі тавараў на 13 млн. руб.

Катэгарычныя дырэктывы партыі і ўрада аб адгрузцы тавараў шырокага спажывання не выкананы. Аднак, ні адзін з прадстаўнікоў прамыслова-збытавых кантор не палічыў патрэбным даць сур'ёзны аналіз прычынам дрэннай адгрузкі.

Безадказнасць, самастрахоўка, узвальванне віны на другіх, імкненне схавацца за шырмай «аб'ектыўных прычын» — усё гэта характарызуюць выступленні ўдзельнікаў нарады.

Усе, толькі не мы

На вёску адгружана толькі 38 проц. квартальнага плана завоза цукру.

Дырэктар Белкапторгы Саюзцукра тав. ШАЕВІЧ абвінавачвае ў гэтым усіх, толькі не сябе. Ён рабіў, ён дабіваўся, ён тэлеграфаваў, ездзіў, а вось... Чыгунка не дае вагонаў. Белкаапсаюз не здаў 38 тыс. мяшкоў, запасычанасць спажывецкай сістэмы складае звыш 388 тыс. руб. Усё гэта затрымлівае адгрузку.

Правільна... 38 тыс. мяшкоў — гэта тара для 200 вагонаў. Белкаапсаюз нясе поўную адказнасць за затрымане тары. Але што зрабіла кантора Саюзцукра, каб атрымаць не? Чаму работнікі Белкаапсаюза давіваліся аб гэтым толькі на нарадзе? Чаму тав. Шаевіч не забяспечыў планавага завозу цукру? Характэрны прыклад бяспланавасці і безадказнасці ў рабоце. Барысаўскі раён доўгі час не атрымліваў цукру, мяк тым па працягу аднаго дня ў Менск завезен цукар на ўвесь квартал. Прышлося частку прадукцыі адправіць у Барысаў — зусім лішнія выдаткі на разгрузку і перагрузку.

Аб гэтым тав. Шаевіч палічыў за лепшае ўмаўчаць.

Дзе Крэмер быў раней?

Некалькі месяцаў на многіх раёнах зусім не было солі. Заяўкі на гэтую прадукцыю першай неабходнасці сістэматычна не выконваюцца. Што зрабіла беларуская кантора Саюзсолі? Кіраўнік канторы тав. КРЭМЕР распінаўся на нарадзе ў сваёй адданасці справе: ён не спіць цэлыя ночы, ён нават захварэў на рабоце. Але што ён можа зрабіць, калі чыгунка падводзіць, калі вагонаў не даюць.

Тав. ЛЕВІН і БЕЛЬСКІ фактамі ілюстравалі, як выконвае кантора Саюзсолі дырэктывы аб адгрузцы. Летам, калі можна было большмоці лёгка адрымаць вагоны, кантора спала, нічога не рабіла, а цяпер ўсхамянулася і падняла трывогу. Свайчасова не ставілі пытання аб пецадгрузцы, аб зрыве планаў, спакойна рэгістравалі скаргі мясц, а цяпер б'юць сябе ў грудзі і крычаць аб зясконных ночах. Якая цана гэтым крыкам! Чаму нельга было пасланць работніка непасрэдна на рудзікі, дагаварыцца з цырэцкім Паўднёвым чыгунак. І тут зноў тая-ж бяспланавасць, тыя-ж напляваўцельскія адносіны да патрабаванняў спажыўца.

Валёнкі—летам, балеткі—зімой

Многа тавараў на нарадзе аб абутку. Прадстаўнік Саюзскуры тав. ГАРДОН выступіў уперад цяжкую артылерыю лічбаў. План будзе выкананы. Ужо адгружана 73 проц. задання. Маглі-б больш, але чыгунка тарозіць. На гомельскай базе скапілася 20 тыс. пар абутка выраба фабрыкі «Праца». Гомельскі раён чыгункі не выконвае нават сцверджаных планаў падачы вагонаў.

Тав. Гардон, аднак, абыйшоў мімо важнейшага пытання якасці абутка. Нікому не сакрэт, што адгружаецца абутак ніжай якасці. Дагавор аб тым, што адхіленні ад першага гатунка не павінны перавышаць 9-10 проц., сістэматычна не выконваецца. Адхіленні часта дасягаюць 40 проц. Аднак, ў пад маркай першага гатунка навязваюць часамі яўны брак.

Бяспланавасць у завозе і закупцы тавараў асабліва дае сябе адчуваць на гэтым участку. Справа даходзіць да яўных здзекаў са спажыўца. Летам крамы завалены валёнкамі, зімой іх няма. Затое зараз крамы перапоўнены балеткамі і гумовымі туфлямі — гэтага дабра колькі хочаш.

Многім раёнам завезена вялікая колькасць абутка, а вось Дзяржынскі раён атрымаў толькі 25 проц. плана.

Менская лямцавая фабрыка сістэматычна выпускае валёнкі надзвычай нізкай якасці. Белкаапсаюз заключыў з фабрыкай дагавор па пастаўку 75 тыс. пар валёнак. Ён патрабаваў тавар добрай якасці. Што робіць Наркамлёгпрам? Замест таго, каб далямагчы спажывецкай каператыўі, ніяк лакараць бюракратызм, ён ануляе дагавор з Белкаапсаюзам.

За шырмай абвінавачвага акта

Красамоўна тавары на нарадзе дырэктар усебеларускай канторы Саюзшвэйзбыта тав. ДРАГІЛЕЎ. Ён прад'явіў рахунак спажывецкай каператыўі. Нізавая частка каператыўі сабатуе тавараль гатовай адзежай. Віцебскі і суражскі райсаюзы не выбіраюць атрыманых тавараў, не перадаюць іх сельспажыўтаварыствам. Не падрыхтаваны кадры людзей, ведаючых адзежу. Няма ўважлівага, культурнага абслугоўвання спажыўца. У радзе крам адзежа прапахла селядцамі і газай.

Чаму нельга адкрыць у раёнах крамы па гандлю гатовай адзежай? Навошта калгаснікам ехаць у горад за гэтым?

Нічога не скажаш супроць гэтага. Абвінавачы акт па адрасу каператыўі зусім прунтоўны.

Але тав. Драгілеў свядома не заўважыў сучка ва ўласным воку.

Як завозіць кантора Саюзшвэйзбыта тавар? Той-жа знаёмы малюнак. Лёгкія чаркалёвыя сукенкі і дэмісезонныя паліто — зімой, шубы, цёплая адзежа — летам. Полацкая база зусім правільна зрабіла, калі адмовілася выкупаць прысланыя паркалёвыя сукенкі на 12 тыс. руб. Непатрэбны каператыўі складах. А цёплыя пальчаткі? З якога часу яны сталі дэфіцытным таварам? Гэта — плады безадказных адносін да снабжэння працоўных.

Характэрны прыклад. Менская база ў пачатку восені дала заяўку на 5 тыс. зімовых плюшавых паліто. Дырэктар канторы Саюзшвэйзбыта тав. Драгілеў імкнуўся навязаць абавязкова зімовыя плюшавыя паліто з футрам, якія каштуюць у два разы даражэй. Пасля доўгай цяганіны і перапіскі з Масквой заказ фактычна анулявае.

Поўную адказнасць за дрэннае выкананне планаў таваразвароту нясе і спажывецкая каператыўі.

Гандляваць культурна, па-совецку, штодзённа вывучаць і арганізоўваць попыт калгасных мас, настойліва і ўпарта змагацца за якасць і асартымент — такія патрабаванні пад'ёму партыі да гандлёвых арганізацый.

Не могуць быць дапушчаны малейшая расхлябанасць і безадказнасць на важнейшым участку эмы які горада з вёскай.

БУТОМАЎ.

НА ПАСТАНОВУ УРАДА АДКАЗАЦЬ ВЫПУСКАМ ДОБРАЯКАСНАЙ ПРАДУКЦЫІ

Пастанова ЦВК і СНК СССР аб крымінальнай адказнасці за недобрасякасны і некамплектны выпуск прадукцыі мае надзвычай важнае палітычнае значэнне. Нельга больш цярпець злачынна-нядбайных адносін асобных гаспадарнікаў да якасці прадукцыі. Наша прамысловасць тэхнічна ўзброілася і мае ўсе магчымасці вырабляць прадукцыю высокай якасці. Трэба толькі ўмець выкарыстоўваць гэтыя магчымасці, па-большэвіцку авалодваць новай тэхнікай, асвойваць тэхналагічныя працэсы вытворчасці, а галоўнае — добрасумлен на адносіцца да працы.

А што мы маем у сапраўднасці? Пяссобныя нашы гаспадарнікі—дырэктары трэстаў і прадпрыемстваў — не толькі не арганізоўваюць як след тэхнічнага навучання рабочых з мэтай павышэння іх кваліфікацыі, але і не забяспечваюць жорсткага кантроля за выпускам прадукцыі, каб не прапускаць на склады бракаванай прадукцыі і жорстка біць рублём па элесных бракаробах.

За фактамі хадзіць далёка не трэба. Узяць хоць-бы такія менскія прадпрыемствы як абутковая фабрыка імя КАГАНОВІЧА, дзе ўпрацоўчы завод імя М

ПРЫЁМ ПРАДСТАЎНІКОЎ СОВЕЦКАГА і ЗАМЕЖНАГА ДРУКУ Ў п. ВІЛЬЯМА БУЛЛІТА

13-га снежня, у 3 гадзіны дня, пасля ўручэння верыцельных грамат, надзвычайны паўнамочны пасол ПАЗШ у СССР п. **БУЛЛІТ** прыняў прадстаўнікоў совецкага друку і замежных карэспандэнтаў.

Булліт, паведаміўшы, што ён раніцой уручыў М. І. Калініну свае верыцельныя граматы, прачытаў журналістам тэксты прамоў, якімі абмяняліся ён і т. Калінін пры ўручэнні верыцельных грамат.

Затым п. Булліт гутарыў з журналістамі, адказваючы на шматлікія пытанні, пастаўленыя яму совецкімі і замежнымі журналістамі.

Амерыканскія карэспандэнты запыталіся ў пасла аб яго бліжэйшых планах. Пасол адказаў, што ён думае прабыць у Маскве толькі самы кароткі час, неабходны для падшукання памяшкання для пасольства і консульства.

— Да інструкцый, атрыманых мною ад прэзідэнта Рузвельта, — сказаў п. Булліт,—я не маю нічога дадаць. Гэтыя інструкцыі гаворыць, каб я выехаў у Маскву, пад шукаў у найкарацейшы тэрмін памяшканне і вярнуўся ў ПАЗШ для складання персанала пасольства і консульства. Совецкі ўрад аказвае мне ў гэтых адносінах усямерную дапамогу. Я і мае супрацоўнікі агледзелі ўжо рад памяшканняў. Калі мы ўладзім справу з падшуканнем памяшкання, я думаю вярнуцца ў Вашынгтон для даклада прэзідэнту. Думаю, што ў канцы студзеня я вярнуся ў Маскву ужо с пасольствам, якое пры ступіць да работы ў пачатку лютага.

На запытанне аднаго з амерыканскіх журналістаў аб вядзенні перагавораў аб гандлёвым дагаворы п. пасол адказаў:

— Я быў-бы вельмі рад што-небудзь сказаць па гэтаму поваду, але пакуль яшчэ няма чаго гаварыць. Адно я магу сказаць, што, пачынаючы з абмена пісьмамі паміж Рузвельтам і Калінiным, усё у нашых адносінах ідзе шпаркімі шагамі і к пытанню аб гандлёвым дагаворы мы, несумненна, хутка падыйдзем.

Далей п. пасол паўтарыў, што зараз ён занят толькі падшуканнем памяшкання, неабходнага для 80 чалавек мяркуемага склада пасольства і маскоўскага консульства.

Адказваючы на пытанні совецкіх журналістаў п. пасол адказаў, што пасля зварота з Вашынгтона ён намеран многа падарожнічаць па Совецкаму Саюзу, пабываць і агледзець усе краі і рэспублікі СССР.

Ён адзначыў таксама, што з часу свайго апошняга прабывання ў Маскве, з 1932 г., ён знайшоў тут значныя палепшэнні.

— Даволі выйсці на вуліцу, — сказаў п. пасол,—паглядзець на людзей, на будаўніцтва, на рух, каб пераканацца ў тым вялікім прагрэсе, які меў месца ў развіцці горада, не гледзячы на тое, што ўся краіна аддавала сваю галоўную увагу цяжкай прамысловасці.

Адказваючы на пытанне аднаго з амерыканскіх журналістаў, ці задаволен ён тым фактам, што ён быў праў у сваім прагнозе аб будучым СССР, зробленым ім у першым наведванні Совецкай Расіі ў 1919 годзе, п. пасол з усёй шчырасцю пацвердзіў, што само сабой разумела, ён гэтым вельмі задаволен.

Адказваючы на пытанне аб перспектывах навуковага і культурнага супрацоўніцтва паміж абодвума краінамі, п. Булліт сказаў, што ў ПАЗШ шмат вучоных і пісьменнікаў жадаюць гэтага супрацоўніцтва, якое, несумненна, будзе шырока развівацца.

Закрануўшы сваю гутарку з М. І. Калінiным, якая адбылася пасля ўручэння верыцельных грамат, п. Булліт заявіў, што ён «меў вельмі прыемную і сардэчную гутарку з п. Калінiным па пытанню аб супрацоўніцтве паміж абодвума краінамі».

— Без усякага сумнення,—дадаў п. пасол,—мы будзем мець сапраўды шчырыя сяброўскія адносіны».

Пасля гутаркі з журналістамі было прапанавана снеданне, у часе якога яны жвава гутарылі з п. Буллітам і чынамі амерыканскага пасольства.

АПОШНІ ЭТАП ЛЕЙПЦЫГСКАГА СУДЗІЛІШЧА

ПАЧАЛІСЯ СПРЭЧКІ БАКОЎ

ЛЕЙПЦЫГ, 13 снежня. (БЕЛТА). Сёння суд уступіў у апошнюю стадыю. У зале шмат журналістаў. Перад пачаткам спрэчак бакоў заслухоўваюцца паказанні экспертаў па графалогіі. Суд пасля падрабязнай экспертызы прышоў да вывада, што почарк Вернера Гэрша неідэнтычны з почаркам Пэтара на квітанцыях, знойдзеных у Папова.

Такім чынам **АБВЯРГАЕЦЦА ВЕРСІЯ** аб сувязі паміж германскімі комуністычнымі дзеячамі і балгарамі.

Паліцэйскі чыноўнік Цукер, які дапытваў Енке і іншых рабочых, катэгарычна адмаўляе, што ім ужываліся пагрозы. Дзімітраў напамінае паказанні сведак Енке і іншых, што ім пагражалі і што яны павінны былі падпісацца пад усім тым, што ім прапанаваў паліцэйскі чыноўнік.

Паліцэйскі чыноўнік настойліва адмаўляе гэта.

Затым Дзімітраў напамінае, што ён прэбаваў расследаваць заяву паліцэйскага чыноўніка з Дусельдорфа, быццам там быў знойдзен у комуністаў яд, які прызначаўся для атручання штурмавікоў. Суд па гэтаму пытанню не вынес ніякага рашэння. Пракурор заявляе, што ён не прыдае значэння гэтаму пытанню.

Дзімітраў патрабуе тады агаласіць матэрыял па поваду паведамлення чыноўніка з Дусельдорфа, быццам там была выкрыта комуністычная змова з мэтай замаха на сакратара соцыял-дэмакратычнай арганізацыі.

Калі старшыня спыняе Дзімітрава, Дзімітраў заяўляе: «Я лічу гэта вельмі важным, бо абвінавачаныя па гэтай справе комуністы былі судом апраўданы. Усё аказалася легендай, аднак, гэта было скарыстана ў якасці аргумента супроць комуністаў».

Пракурор пярэчыць супроць агалашэння гэтых судовых матэрыялаў. Тады Дзімітраў напамінае сваю старую прапанову аб расследванні пытання, ці ідэнтычан доктар Дрэшэр, які паказваў, быццам ён бачыў Дзімітрава ў рэйхстагу з супрацоўнікам «Фелькішэр беабахтэр» Цымерманам. Цымерман у сваёй газеце сцвярджаў, што Дзімітраў з'яўляецца ўдзельнікам замаха на ўзрыў софійскага сабора. Пасля кароткай парады, суд адхіляе прапанову Дзімітрава. Старшыня суда ўказвае, што аб Цымермане будуць наведзены спраўкі, і аб гэтым будзе паведамлена абаронцу Дзімітрава.

Затым заслухоўваецца паліцэйская спраўка пакант таго, ці былі якія-небудзь указанні ўлад аб падрыхтоўцы адпора рыхтуючамуся комуністычнаму паўстанню. У спраўцы ўказваецца, што Герынг 10 студзеня даў паліцыі пуснае распараджэнне і ўпаўнаважыў скацэнтраваць паліцэйскія сілы пад адзіным кіраўніцтвам, каб паралізаваць дзейнасць компартыі. Калі Дзімітраў у сувязі з гэтым прабуе гаварыць, старшыня рэзка абрывае яго: «Я не дапушчу далейшых выказванняў. Вы хочаце гэтым зацягнуць працэс». На гэтым заканчваецца судовае следства. Пасля кароткага перапынка адкрываецца спрэчкі бакоў прамовай вярхоўнага пракурора

ДЫВЕРСІІ АУСТРЫЙСКІХ НАЦ.-СОЦЫЯЛІСТАЎ

ВЕНА, 13 снежня (БЕЛТА).

За апошні час дыверсійная дзейнасць аўстрыйскіх нацыянал-соцыялістаў узмацнілася. У Вене яны падрыхтоўвалі ўзрыў поезда на Заходнім вакзале.

У Лінцы нацыянал-соцыялісты кінулі бомбу ў дом бургамістра. У Брэгенцы і ў радзе гарадоў Тыроля —Дортбіне, Люстэнау і інш.—мелі месца нацыянал-соцыялісцкія замахі на будынкі муніцыпалітэтаў і на дамы кіраўнікоў хэймвера.

У сувязі з гэтым урад аб'явіў аб рэпрэсіях супроць нацыянал-соцыялісцкіх правадыроў. Многія відныя нацыянал-соцыялісцкія лідэры ўжо пераведзены ў канцлагеры. Урадавы друк у Брандмаркце ўказвае, што будуць прыняты далейшыя карныя меры.

НА АБАРОНУ

Торглера, Дзімітрава, Папова, Танева

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 13 снежня (БЕЛТА). Берлінскі спецыяльны карэспандэнт «Энтрансіжан» ганьбіць Герынга за яго прамову аб лейпцыгскім працэсе і заўважае, што выступленні Герынга і Гебельса не адхілілі падазрэнняў замежнага друку адносна сапраўдных матываў, пабудзіўшых іспэніраваць працэс.

* * *

ПАРЫЖ, 13 снежня (БЕЛТА). Згодна паведамлення «Юманітэ», заўтра ў Парыжы і ва ўсіх гарадах Францыі адбудуцца мітынгі пратэста супроць абвінавачання Дзімітрава, Торглера, Папова і Танева у падпале рэйхстага.

19-та снежня **ПА ЎСЁЙ ФРАНЦЫІ АДБУДУЦЦА ДЭМАНСТРАЦЫІ СУПРОЦЬ ЛЕЙПЦЫГСКАГА ПРАЦЭСА.** Мітынгі і дэманстрацыі будуць праводзіцца пад лозунгам: «Выратуйце Дзімітрава, Торглера, Папова і Танева».

Міжнародны камітэт дапамогі ахвярам фашызма ў звароце да ўсіх грамадскіх арганізацый заклікае пратэставаць супроць лейпцыгскага працэса і прымаць удзел у кампаніі за вызваленне абвінавачаных комуністаў.

Адвакаты Віллар (Францыя), Дэчэл (Балгарыя) і Галахер (ПАЗШ), якія прысутнічалі на працэсе, звярнуліся з пісьмом да ўсіх адвакатаў, у якім, указваючы, што падпальшчыкамі рэйхстага з'яўляюцца нацыянал-соцыялісты, заклікаюць арганізаваць сходы адвакатаў і прымаць рэзалюцыі пратэста.

АНГЛІЯ

ЛОНДАН, 13 снежня (БЕЛТА). Як указвае орган компартыі «Дэйлі уоркер», новыя папросы Герынга сведчаць, што падсудным рэвалюцыянерам пагражае кара смерцю. Газета заклікае да масавых дэманстрацый у абарону Дзімітрава, Торглера, Танева і Папова, указваючы, што гэта адзіны сродак для іх выратавання. **МОПР 17-ГА СНЕЖНЯ АРГАНІЗУЕ ДЭМАНСТРАЦЫІ ПРАТЭСТА ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ.**

ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА, 13 снежня. (БЕЛТА). У сувязі з надыходячым выступленнем пракурора на лейпцыгскім працэсе чэхаславацкі друк заклікае грамадскасць да пільнасці.

Паводле слоў «Прагер мітгат», паводзіны Герынга нельга распазнаваць інакш, як адкрытае ўмяшанне ў працэс. Газета лічыць, што адзіны сродак выратаваць 4 нявінных рэвалюцыйных ахвяр лейпцыгскага працэса заключаецца ў сваячасовым умяшанні сусветнай грамадскай думкі.

Рабочыя ў Братыславе прад'явілі германскаму консулу пратэст, прымяты прадстаўнікамі рабочых усіх заводаў у Братыславі.

ФРАНЦУЗСКІ ДРУК ВЫСМЕЙВАЕ ФАШЫСЦКУЮ КАМЕДЫЮ З АДКРЫЦЦЁМ ГЕРМАНСКАГА РЭЙХСТАГА

ПАРЫЖ, 12 снежня. (БЕЛТА). Французскі друк у гіранічных тонах апісвае адкрыццё германскага рэйхстага. «Мотэн» устанаўляе, што пасяджэнне цягнулася роўна 7 мінут 30 секунд і што Герынг быў падобен на камандзіра, які аддае каманду «салдатам — дэпутатам». «Эко дэ Пары» піша, што па камандзе Герынга «600 мундзіраў палымяюцца, а затым садзяцца як аўтаматы».

БАРЫКАДНЫЯ БАІ Ў ГІШПАНІІ

ПАРЫЖ, 13 снежня. (БЕЛТА). Як паведамляць з Гішпаніі, хваляванні прадаўжаюцца, не гледзячы на ўзмоцненыя рэпрэсіі ўрада.

У правінцыях Сарагоса, Леон, Кардова, Кадзіко, Алікантэ, Хуэска, Логроньо і у Барселоне бесперапынна адбываюцца сутычкі паміж паўстанцамі, з аднаго боку, паліцыяй і войскамі,—з другога. Шмат забітых і раненых з абодвух бакоў.

У Сарагосе рабочыя пабудавалі барыкады і ўмацавалі чыгуначныя майстэрні. У Сабрэра (правінцыя Леон) рабочыя падпалі наступу ўрадавых войск, якіх падтрымлівала паветраная эскадрылья. Усеагульныя забастоўкі прадаўжаюцца ў Сарагосе, Хуэска, Сан - Себастыяне, Карунь, Ферол, Хіхоні, Барселоне, Гранадзе, Валенсіі, Кардове, Севільі, Алжэзірасе і Мадрыдзе.

* * *

ПАРЫЖ, 13 снежня (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, дэпутат Болівар выступіў на пасяджэнні кортэсаў (парламент) па поваду хвалявання, ахапіўшых амаль усю Гішпанію.

Болівар узяў пад самую рэзкую крытыку рэпрэсіі ўрада супроць паўстанцаў. Старшыня кортэсаў не раз абрываў Болівара.

ЖУДАСНАЕ СТАНОВІШЧА ПОЛЬСКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

ВАРШАВА, 13. снежня. (БЕЛТА). Буржуазны друк б'е трывогу па поваду «перавытворчасці інтэлігенцыі», патрабуючы далейшага абмежавання доступа ва універсітэты працоўнай моладзі.

Орган лодзінскіх прамыслоўцаў «Правда» прапануе ў інтарэсах капіталістычнага грамадства рашуча «пакончыць з масавай вытворчасцю інтэлігенцыі».

Польскі друк адначасова адзначае бядотнае становішча польскай інтэлігенцыі і вучнёўскай моладзі. «Вечар Варшаўскі» адзначае, што каля паловы работнікаў разумовай працы з сем'ямі зарабляе менш 60 злотых у месяц, што не забяспечвае пражытачнага мінімума.

Каля паловы слухачоў вышэйшых навучальных устаноў не могуць уносіць платы за вучэнне і стаяць перад патрозай выключэння. «Газета варшавска» піша: «Туберкулёз спустошае рады моладзі. Дрэннае харчаванне і антысанітарныя жыллёвыя ўмовы стваряюць спрыяльную глебу для гэтай хваробы».

БЯСЧЫНСТВЫ МАНЧЖУРСКІХ ЧЫНОЎНІКАЎ І ПАЛІЦЭЙСКІХ

ХАБАРАЎСК, 10 снежня (БЕЛТА). У сувязі з незакончанымі дзеяннямі на ст. Бухэду манчжурскіх агентаў і збіваннем японскім совецкім Манчжоу Го Сато адказнага служачага канторы участка службы цягі совецкага грамадзяніна Маркоўскіх — 8.XII кіраўнік КУЧ т. Руды камандзіраваў на ст. Бухэду інжынера Несперава для афіцыяльнага расследвання. Аднак, паліцыя ст. Бухэду не выпускала з вагона прыбыўшага гр. Несперава і каля вагона быў выстаўлен паліцэйскі парад.

Тав. Руды звярнуўся з тэлеграмай да начальніка паліцыі, у якой указаў, што грубае ўмяшанне чыноў паліцыі ў аперацыйную дзейнасць дарогі парушае нармальную работу і катэгарычна патрабаваў неадкладнага спынення гвалтаў агентаў паліцыі і прадстаўлення гр. Несперару магчымасці правядзення афіцыяльнага расследвання. Адначасова т. Руды далажыў аб здарэнні праўленню КУЧ. Паліцэйскі парад быў знят, і інжынер Несперар прыступіў да расследвання.

9 снежня нам. таварыша старшыні праўлення КУЧ т. Бандура заявіў старшыні праўлення Лі Шао-гэну пісьмовы пратэст, кваліфікуючы адстаўленне ад работы совецкіх кіраўнікоў ледзьвелаў службы цягі у Бухэду як працяг манчжурскімі ўладамі палітыкі парушэння дагавораў аб КУЧ, і патрабаваў тэрміновага склікання пасяджэння праўлення КУЧ для разгляду пытання аб самачынных дзеяннях манчжурскага намочніка службы цягі Тян Сі-фу, самавольна на прысвоўнага функцыі начальніка службы цягі і дэзарганізаваў шага работу па лініі, і аб прыцягненні да адказнасці японскага дарадца Сато.

МЕНСК СТАНОВІЦЦА АДНЫМ З БУЙНЫХ ПРАМЫСЛОВЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ГАРАДОЎ СССР

ПЛЕНУМ МЕНГАРСОВЕТА

Учора адбыўся чарговы пленум Менгарсовета. Пленум абгаварыў даклад тав. **Каранёўскага** аб задачах гарсовета ў рэалізацыі мерапрыемстваў, прынятых у пастанове ЦВК СССР па дакладу аб рабоце Менгарсовета.

Выступаўшыя ў спрэчках дэпутаты спыняліся на недахопах у рабоце гарсовета і прапаноўвалі практычныя меры па ліквідацыі іх.

З вялікай прамовай на пленуме выступіў старшыня ЦВК СССР і БССР тав. Чэрвякоў, які падрабязна адзначыў задачы членаў совета ў галіне ажыццяўлення пастановы ЦВК СССР, якая канстатуе, што **Менск становіцца адным з буйных прамысловых і культурных гарадоў Совецкага Саюза.**

Пленумам прынята адозва да ўсіх працоўных Совецкай Беларусі і пасланы прывітальныя тэлеграмы т. т. **Сталіну, Молатаву, Калініну, Енукідзе і Гікало.**

Аб нявыездзе тав. Шорніка, дырэктара шклазавода на ільназагатоўкі ў Строчыцкі сельсовет

Пастанова сакратарыята Менскага ГК КП(б)Б

Абвясціць тав. Шорніку суровую вымову за нявыезд у сельсовет, пра панаваўшы яму зараз-жа выехаць.

Паведаміць усіх таварышоў, пасланых гаркомам КП(б)Б у сельсоветы на ільназагатоўкі, што ў выніку, калі будзе ўстаноўлен нявыезд у сельсовет, або выезд з сельсовета без дазволу ГК КП(б)Б, яны будуць прыцягнуты да суровай партыйнай адказнасці.

За сакратара менскага ГК КП(б)Б ГЕРШОН.

Паведамленні

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б паведамляе, што 17 і 18 снежня г. г. ў г. Менску будзе працаваць рэспубліканская камісія па разгляду апеляцый на пастановы жлобінскай і буда-кашалёўскай райкамісій, наступных т. т.

17 СНЕЖНЯ Ў г. ЖЛОБІНЕ:

Круціка́ў П. С., Вараб'ёў А. І., Бабкоў Н. Ф., Кавалёў К. А., Сідорка Л. С., Чэрнякоў П. В., Спірыдонаў А. М., Лісейчыкаў Т. Г., Навакоўскі Е. Я., Турлай О. Ф., Парфёненка К. Ф., Непачаты С. А., Кнігіна А. І., Пракофенка К. І. (Буда-Кашалёўскі раён);

Янушка І. І., Яўсеєў Ф. А., Паўловіч І. М., Карунчык А. І., Гурэвіч М. Л., Грышкоў Н. Г., Рэвякоў Г. К., Гаравой Н. Г., Сосна Н. І., Барсукоў І. П. (Жлобінскі раён).

18 СНЕЖНЯ Ў г. ЖЛОБІНЕ

Казлоў П. Э., Непакойчыцкі А. А., Васарадзіс І. С., Старасоннікаў В. К., Чыкілёў І. Д., Медзведзеў П. К., Касценка І. У., Купрыленка І. Г., Лукін І. Г., Рэвякоў Е. І., Селіцкі І. Е., Чэрнякоў Ф. Д., Марозаў І. В., Зенчук Н. М., Тутунік І. Н., Каралёў І. С., Наяшонак А. Е., Курскі І. С., Бурэвеў А. Е., Самчук А. І., Бобрык С. К., Пранкоў М. В., Жабко А. В., (Жлобінскі раён).

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

* * *

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б паведамляе, што 20, 21 і 22 снежня г. г. ў г. Гомелі будзе працаваць рэспубліканская камісія па разгляду апеляцый на пастановы гомельскай гаркамісіі і веткаўскай, чачэрскай і ўкраўраўцкай райкамісій наступных т. т.:

20 СНЕЖНЯ Ў г. ГОМЕЛІ:

Рэмізонава Е. М., Гладышоў К. А., Скользаеў А. Е., Махораў К. Л., Мікулін Ф. С., Кускоў Ф. М., (Веткаўскі раён).

Шэбалдаеў С. В., Мельнікаў М. С., Гулевіч І. Г., Новікаў І. М., Апанасенка Т. Г., Акулава А. І., Ермакоў В. Л., Белаусаў С. М., Патапенка І. І., Сталярчук П. І., (Чачэрскі раён).

Фралоў С. М., Абрамаў А. Б., Карпенка М. Е., Сергіенкоў П. Т., Лапіцкі В. Ф. (Уваравіцкі раён).

Падбел П. А., Самковіч І. С., Бамм Г. С., Рэзнікоў А. М., Шэўцоў Н. В., Рынберг І. М., Мельнікаў І. І., Глюберман Н. І., Барэўскі Е. Ф., Макарэнка В. І. Шульман Б. В., Семенчукоў І. М., Белашэвіч А. І. (Гомельскі раён).

21 СНЕЖНЯ Ў г. ГОМЕЛІ

Лібман Г. Е., Сачыўкін А. Г., Сінозберг А. М., Новікаў Ф. С., Пасудубка Е. М., Будзінскі І. М., Пархоменка Е. І., Куцікаў З. Ф., Грабоўскі Е. Я., Майнбург Я. М., Канелюк Ф. М., Хруцкая Е. С., Абрамцоў А. Б., Майсеенка П. Л., Механікаў В. Х., Цепліцкі Д. І., Венгэн Н. А., Мельнікаў В. Я., Лібман Е. А., Шісман Н. Я., Гурын В. П., Сельтэр Я. Х., Шэйман І. С., Баравой Я. М., Балданаў Н. А.

22 СНЕЖНЯ Ў г. ГОМЕЛІ

Кухаронак Н. П., Левітанскі В. Н., Шапшалоў Р. Ю., Соркін С. Н., Шукцін Ф. Б., Кабрынскі Н. В., Пашноў І. Ф., Залатаўцка Н. В., Суўеў В. А., Клімкоў В. Р., Афанас'ев А. І. Гарбачоў Ф. М., Карэткевіч М. І., Зеленовіч І. В., Лімантоў Ф. А., Ульяніцкі П. К., Каштаноў С. С., Шышоў І. А., Лавоўскі С. М., Чэроў В. Г., Замараеў М. З., Янічэў Е. С., Паін М. Я., Кузьмін І. Е.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

* * *

15-XII г. г. а 20 г. 00 м. праз Мскую радыёстанцыю перадасцца л**цыя-даклад т. ГЕРШОНА: «Вып партыйна-масавой работы партка**тываў масковскіх заводаў».

* * *

ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. Б**туха, прадаваўшага раней у круп**скай арганізацыі і Зеліцкага Івана Іванавіча, працаваўшага раней Чавусах, т. Родзева Дзімітрыя, чл**на партыі з 1920 г., б. нам. начп**літаддзела саўгаса Конічы, Касцюк**віцкага раёна, паведаміць ПК ЦК** (Менск, Дом урада) адрас месца работы і жыхарства без выезда **Менск.**

Просьба да ўсіх партарганізацый, ведаючых аб месцы знаходжання паказаных таварышоў паведаміць ПК ЦКК.

Партканцелярыя.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

Кіно-тэатр „Чырвоная Зорка“

Ад 15 снежня Аста НІЛЬСЕН

У вялікім замежным мастацкім фільме

ЖАНЧЫНА Ў АГНІ

У праграме — новы гукавы Союзкінанумрил

НАСУСТРАЧ ДВУМ МАРАМ

Беламорска-Балт. Канал

Штодзенна 4 сеансы. Пачатак а 6, 7·30, 9 і 10·30.

КАСА—ад 1 гадз. дня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА.

Сёння, 15 снежня Опера

Мастацкі кіраўнік, галоўны дырыжор заслуж. арты ст. рэспублікі тав. ГІТГАРЦ І. А

ЯЎГЕНІ АНЕГІН

Муз. Чайкоўскага.

Пастаноўка рэжысера Ольгі Барысевіч.

Дырыжор—БЕЛЯЎСКІ.

Пачатак роўна у 8 гадз. вечара

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

вул. Валадарскага, 7, тэл. № 21-813)

Сёння, 15 снежня

РЭКРУТ

Пастаноўка заслуж. артыста рэспублікі

М. Ф. РАФАЛЬСКАГА.

Пачатак у 8 гадз. вечара

Кіно ПРОЛЕТАРЫЙ — МЫЛЬНАЯ ПЕНА

Кіно Інтэрнацыянал — Мастацкі замежны фільм СЯБРОЎКА МАРАКА (Казанне і абавязак)

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр — Мастацк. фільм МАЛЕНЬКІ МУК камедыя (з казкі „1001 ноч“)

КІНО СПАРТАК — Замежны фільм ЗЯЛЁНЫ ЗАВУЛАК драма ў 6 частках.

ДЛЯ ВЫГАДЫ ПАДПІСЧЫКАЎ

штодзенна і ў выходныя дні ад 9 гадз. раніцы

да 9 гадз. вечара

БЕСПЕРАПЫННА АДКРЫТ

аддзел падпіскі Менгарбюро „САЮЗДРУК“

(будынак пошты, 2-гі паверх)

для прыёма падпіскі на газеты і журналы на 1934 год.

ЗДАВАЙЦЕ ПАДПІСКУ СВАЯЧАСОВА!

ВЫДАВЕЦТВУ „ЗВЯЗДА“ тэ кіерва

ПАТРЭБНА

кваліфікаваная МАШЫНІСТКА

Звяртацца: Совецкая, 63, 2-гі паверх.

ПРАПАЛА кабыла з сядлом, цём на-рыжая страявая. Просьба паведаміць: вёска Уручча, Калодзішчанскага с-с., ЗВК № 2.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛАНС БЕЛКААППРАМСОВЕТА НА 1 СТУДЗЕНЯ 1933 г.

АКТЫВ:

№№ гал. рах.	НАЗВА ГАЛОЎН. РАХУНКАЎ	АГУЛЬН. СУМА	% да бал.
1.	Маемасць	344799—76	9.4
4.	Каштоўныя паперы	385860—00	10,5
3.	Паі і акцыі	69961—42	1,9
6.	Спецыяльныя ўклады ў крэд. уст.	306894—24	8,3
7.	Мэтав. доўгатэрм. пазыкі	785367—03	21,4
8.	Нязэўныя даўгі	262800—18	7,1
10.	Каса	162—33	—
12.	Разл. рахункі ў банку	13580—36	0,4
19.	Гаспад. і ўпаков. матэрыялы	822—20	—
22.	Дакументы к утрыманню	1482—09	—
25.	Падсправаздачныя асобы	411—85	—
29.	Розн. разлікі	115945—13	3,2
32.	Разлікі з б. звеннямі сістэмы	605282—49	16,5
35.	Разлікі са спецсаюзамі	702227—23	19,1
50.	Культасветныя выдаткі	80664—33	2.2
67.	Рабочыя і служачыя	[illegible]	—
	БАЛАНС: руб.	3676580—78	100 %

№№ гал. рах.	НАЗВА ГАЛОЎН. РАХУНКАЎ	АГУЛЬН. СУМА	% да бал.
53.	Асноўны капітал	738638—83	20,1
54.	Запасны капітал	139820—66	3,8
55.	Спецыяльн. капіталы	267073—58	7,3
56.	Паявы капітал	485261—89	13,2
57.	Розныя фонды	175117—38	4,8
60.	Розныя рэзервы	262800—18	7,2
62.	Пазыкі і крэдыты доўгатэрмін.	705835—04	19,2
25.	Падсправаздачныя асобы	1465—33	—
29.	Розныя разлікі	189285—75	5,1
32.	Разлікі з б. звеннямі сіст.	43355—84	1,2
35.	„ з спецсаюзамі	371784—76	10,1
67.	„ з рабочымі і служ.	8203—21	0,2
69.	„ з дэпанентамі	126—25	—
81.	Вынікі справаздач. года	287812—08	7,8
	БАЛАНС: руб.	3676580—78	100 %

ДЭБЕТ — РАХУНКІ ПРЫБЫТКАЎ і СТРАТ ЗА 1932 год — КРЭДЫТ

47.	Адм.-гасп. выдаткі	297548—89
48.	Падаткі і зборы	56473—07
49.	Проц. і камісія ўплочаныя	113792—53
52.	Аперац. і гандл. выдаткі	118017—12
60.	Фонд на пакрыц. нязэўн. даўг.	262800—18
	Прыбытак за справазд. год	287812—08
	РАЗАМ руб.	1136443—87

79.	Ад продажы тавар. і розн. гандля	9783—52
81.	Проц. і камісія атрыманыя	126777—66
82.	Эксплаатацыя маемасці	7349—47
83.	Прыбыткі мінулага года	54141—53
„	Адлічэнні і розн. прыбыткі	938391—69
	РАЗАМ руб.	1136443—87

Старшыня прэзідыума Белкаапрамсовета **БРЫСКІН.**

Галоўны бухгалтар **СЛАБОДКІН.** Рэвкамісія **ШЭРМАН.**

16 снежня у 7 з пол. г. вечара ў памяшканні 25 ФЗО (Совецкая, 44)

адбудзецца

ПЛЕНУМ СЕКЦЫІ НАРАСВЕТЫ

сумесна з загадчыкамі школ горада, дашкольных палітасветных устаноў, па пытанню:

1. Кантрольныя лічбы па народнай асвеце на 1934 г. (дакл. тав. ЗЯНЬКОВІЧ).

Прысутнасць членаў секцыі і загадчыкаў школ. дашкольных і палітасветных устаноў АБАВЯЗКОВА.

Секцыя Нарасветы Менгарвно.

УСЕБЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКА

разам з фінгрупай НК РСІ і Цэнтральным праўленнем саюза ФБР

15 СНЕЖНЯ, у 7 гадз. веч. у памяшканні Белканторы Дзяржбанка, склікае НАРАДУ ўсіх гаспадарчых, гандлюючых, бюджэтных і прафсаюзных арганізацый

па пытанню аб недахопах у рабоце Дзяржбанка па крэдытнаму і разліковаму абслугоўванню кліентуры.

На нараду запрашаюцца кіраўнікі ўстаноў і прадпрыемстваў, галоўбухі, планавыя работнікі, інкасатары і ўсе іншыя, жадаючыя прыняць удзел.

Менск, друкарня «Звязды» Галоўлітбал № 337.